Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! Пролетарии всех стран, соединяйтесь! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ — ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

СУБОТА 21 САКАВІКА 1931 ГОДУ. № 64

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. Т. С. Р.

Учора адкрыўся III усебеларускі зьезд калгасаў

Баявой падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай рапартуюць калгасы БССР

СВАЙМУ ТРЭЦЯМУ ЗЬЕЗДУ

За цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, зьдзельшчыну, ударніцтва і сацыялістычнае спаборніцтва **ВЫСТУПАЮЦЬ КАЛГАСЫ ЕЛЬШЧЫНЫ**

Якасьць працы—у цэнтр увагі!

Узброіць тэхнікай масы калгасьнікаў

1931 год—год, у якім мы завяршаем фундамант сацыялістычнай эканомікі СССР, год, у які ў асноўных і галоўных рысах будзе вырашана пытаньне «хто каго» і ў сельскай гаспадарцы, гэты год будзе годам вялізарнага тэхнічнага пераўзброєньня сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. Калгасы і саўгасы ў тым разумутым сацыялістычным наступленьні на кулака, якое пад кіраўніцтвам партыі праводзіць рабочая клясa, арганізуюць калгасьнікаў і бяднацка-серадняцкія сялянства, атрымаюць магутнае ўзмоцненьне ў гэтае новай тэхнічнай базы. Досыць успомніць, што ў сёлетнім годзе на палёх БССР будуць працаваць больш 1.500 тысяч трактароў, што падвойваецца ў параўнаньні з мінулым годам забясьпечаньне с.-г. машынамі (БССР атрымае на 26 з пов. мільёнаў руб. машын), што значна павялічваецца забясьпечаньне органічнымі ўгнаеньнямі і інш., каб вырашыць ўзяць сабе, якія вялізарныя задачы стаяць перад намі ў галіне асваеньня новай тэхнікі.

Усё гэта і прымушае нас паставіць строка і сур'ёзна пытаньне аб ажыцьцяленьні лёзунгу тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай і ў сельскай гаспадарцы. Калгасьнік павінен быць у гэтых радах байцоў за аўладаньне гэтай тэхнікай, інакш машыны застануцца бяз справы, інакш матэрыяльныя машынай застануцца не асвоеныя шырокімі масамі.

На самай справе, возьмеце нашага адзнага трактарыста. Гэта-ж па сут ці не трактарысты, а рулявыя, якія умеюць кіраваць рулём, але ведаюць трактара. Ці-ж не па гэтым прычыне ў нас пры малейшай перашкодзе, пры самым нязначным папраўленьні трактары выбываюць са строю? Ці-ж не таму ў нас трактары стаяць у лепшых гаспадарках, у перадавых зернясаўгасах працуюць толькі 2—2½ тысячы гадзін? Праўда, гэта ліфба—2—2½ тысячы гадзін у сутки разы прыкладна большая сялянна-амэрыканскай нагрузкі трактара, але мы ня можам здаволіцца гэтай дасягненьнямі. Лепшым скарыстаньнем трактароў, ды і ўсякіх іншых машын, мы ў першую галаву абавязаны тым перавагам, якія мае буйнасацыялістычная сельска-гаспадарка вытворчасьць. Але калі мы параўнаем аўладаем тэхнікай калі на-сапраўднаму ўзброім тэхнічнымі ведамі масы калгасьнікаў,—нашыя дасягненьні будуць значна вышэй. У самай справе, успомніце абураючыя факты паломак трактароў, успомніце, што прыкладна тры чвэрткі ўсяго трактарнага парку патрабавалі на значэньні сэзону капітальнага рамонту і тады зробіцца ясным вялізарнае значэньне і для сельскай гаспадаркі сталінскага лёзунгу аб аўладаньні тэхнікай.

І мы-ж ў гэтым годзе ў масавым парадку выдзем і ўводзім ужо ў эксплоатацыю новага віду тэхніку, ня тэхніку, якую масам калгасьнікаў: лёнацеравы, бульбакапалкі, кораньрэзкі, жмыхрабілкі, машыны для прыгатаваньня сілосу і г. д. і г. д. Ці-ж ня ясна, што мы будзем мець сур'ёзнейшыя перашкоды ў справе скарыстаньня гэтай новай тэхнікі, калі не навядзем у шырокіх разьмерах масавага паходу калгасьнікаў за аўладаньне тэхнікай.

Траба зразумець, што вялізарнейшая магчымасьці і перавагі буйнай сацыялістычнай вытворчасьці ня зможуць быць намі цалкам скарыстаны, калі ня будзе асвоена новая тэхніка, калі ня ўзьму і агратэхніка. Да рэчы, аб гэтай апошняй, аб агратэхніцы зусім мала і свайчасова тав. Якаўлеў на III Усесаюзным зьезьдзе саветаў гаварыў, што інакш, як лёгкадумнасьцю, нельга назваць спробы абвясьціць агратэхніку «буржуазным прадрасудкам».

БССР робіцца краем лёну і канапель, краем мясной і малочнай жывёлагадоўлі. Вось чаму ў першую чаргу нам трэба завастрыць увагу на аўладаньні агратэхнікай і ўсёй тэхнікай вядзеньня гаспадаркі прыстасавальна да паказаных вышэй эканамічных асаблівасьцяй сельскае гаспадаркі БССР.

Траба зразумець, што гутарка ідзе аб мабілізацыі саміх калгасьнікаў, усёй армії калгасьнікаў для шырокага масавага і глыбокага паходу за аўладаньнем тэхнікай. Траба зразумець, што гутарка ідзе аб масавай падрыхтоўцы кадраў, майстраў сельскае гаспадаркі з асяродку саміх калгасьнікаў з дапамогаю цэлай сеткі курсаў, школ і г. д. Трэба зразумець, што адмахнуцца ад гэтай справы, абмежаваць ці толькі павялічэньнем прыёму вучняў у с.-г. ВНУ, тэхнікумы, школы сялянскай моладзі і г. д.—нельга. Зразумелая рэч, пытаньне аб падрыхтоўцы спэцыялістаў сельскай гаспадаркі сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі, аб падрыхтоўцы сваіх спэцыялістаў—пытаньне першараднай важнасьці. Але нельга недаўлічваць таго, што нават пры максымальным напыружаньні прыёмаў вучняў ва ўсе школы мы не пакрыем у бліжэйшыя часы вялізарнай патрэбы ў падрыхтаваных кадрах, у кадрах, якія здолеюць забясьпечыць і асваеньне новай тэхнікі сельскай гаспадаркі і наогул вядзеньне буйнай сацыялістычнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Ітак, мы заклікаем калгасьнікаў у паход за аўладаньне тэхнікай. Такі паход ужо абвешчаны на Украіне. Усеўкраінскі зьлёт ударнікаў саўгасаў, калгасаў і МТС абвясьціў сябе ўдарным у барацьбе за аўладаньне тэхнікай і высунуў прапанову аб Усесаюзным паходзе за хутчэйшае аўладаньне тэхнікай. Нам трэба прыняць гэты выклік украінскіх таварышоў і разгарнуць на-бальшавіцку работу ў сябе, у БССР. Вось тая праграма, якую высунуў зьлёт украінскіх ударнікаў:

«Ударнік аўладаньня тэхнікай у саўгасе, калгасе і МТС павінен стаць перш за ўсё арганізатарам ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці і, уцягваючы ў барацьбу па аўладаньні тэхнікай новыя і новыя пласты рабочых і калгасьнікаў, зрабіць гэтую барацьбу справай саміх шырокіх мас. Стварэньне гурткоў прыцеляў машыны, гурткоў вынаходцаў, рацыяналізатараў, арганізацыя шэфства над машынай, цясьнейшая сувязь з заводамі сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва і навукова-дасьледчымі ўстановамі па мэханізацыі сельскае гаспадаркі...»

Зусім зразумела, што выдатнае месца ў арганізацыі гэтага паходу калгасьнікаў за аўладаньне тэхнікай пры належыць нашым навуковым с.-г. установам, нашым с.-г. ВНУ, тэхнікумам і школам. Стаць на чале гэтага паходу павінны Белкалгасцэнтр, ЦК ЛКСМБ і навукова-дасьледчы інстытут сельскай гаспадаркі.

Мы ўносім на абгаварэньне III Усебеларускага зьезду калгасаў канкрэтную прапанову: абвясьціць усебеларускі паход калгасьнікаў за аўладаньне тэхнікай і распрацаваць канкрэтныя шляхі гэтай работы.

Прычым—і гэта трэба падкрэсьліць з асаблівай сілай—паход за аўладаньне тэхнікай павінен быць напоўнены канкрэтнымі справамі, канкрэтнай барацьбой, разгорнутай вучобай.

Нам патрэбны ня шум, не сьвяточныя бубенны бой, а бальшавіцкая барацьба, сур'ёзная і напружаная за ўзбраеньне ўсёй армії калгасьнікаў шырокімі тэхнічнымі ведамі для пасьпяховай работы па сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі нашай краіны.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

Пра зацьверджаньне тт. Бурстына, Ц. Л., Кедрава-Зіхмана, А. К., Кроля, Б., Лубяка, В. М. Нікольскага, М. Панкевіча, П. Я., Платуна, А. М., Куліна, І. І., Сэрбэнта, В. А., і Шчарбакова, В. К., правадзейнымі членамі Беларускай Акадэміі Навук і тав. Шчарбакова, В. К., Віцэ-Прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зацьверджаць правадзейнымі членамі Беларускай Акадэміі Навук наступных таварышоў: Бурстына, Цэлесіна Лявонцьевіча, Кедрава-Зіхмана, Кедра Карлавіча, Кроля, Міхаіла Балавіча, Лубяка, Васіля Мікітавіча, Нікольскага, Мікалая Міхайлавіча, Панкевіча, Паўла Якубовіча, Платуна, Антона Марцінавіча, Рыўліна, Ізакіеля Ісакавіча, Сэрбэнта, Віталія Андрэевіча і Шчарбакова, Васіля Кар павіча.

2. Зацьверджаць тав. Шчарбакова, Васіля Карпавіча, Віцэ-Прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР С. Кандыбовіч.

19 сакавіка 1931 г.
г. Менск.

Апартуністычная стаўка зрывае падрыхтоўку да сяўбы

Ляднянскія арганізацыі зусім ня рыхтуюцца да другой бальшавіцкай сяўбы. Зерначыстка не праводзіцца, рэмонт с.-г. машын ня скончаны. Арэва партыі і ўраду аб кантрактацыі ярыны не рэалізуецца. На ст. Краснае МББ чыгункі прыбыла 300 мінеральнага ўгнаеньня. Ня гледзячы на неаднаразовыя паведамленьні адміністрацыі чыгункі аб тым, каб Райкалгассаюз забраў груз, апошні і ня думае аб гэтым. Хутка санная дарога прападзе, пойдзе Днепро і неразьмерзваемае ўгнаеньне застанецца ляжаць на станцыі.

П. А.

Уключымся ў сацспаборніцтва на атрыманьне сьцягу

Пробны выезд у поле—гатоўнасьць да сяўбы калгасаў!

15 сакавіка адбыўся пробны выезд дарчы інвэнтар. На астатніх калгасах у поле калгасаў Вендараскага сельсавету, Магілеўскага раёну. У пробным выезьдзе прымалі ўдзел 13 калгасаў висьцілі сябе ўдарнікамі, уключыліся

Праверка гатоўнасьці да другой бальшавіцкай вясны. Выезд у поле калгасаў «Чырвоны Партызан», «Ударнік», «Савецкая Беларусь» і др. Магілеўскага раёну.

сельсавету і аднаасобныя бяднацка-серадняцкія гаспадаркі.

Поўную гатоўнасьць да сяўбы паказалі калгасы «Ударны», «Савецкая Беларусь» і «Чырвоны Партызан».

У гэтых калгасах поўнасьцю скончана засыпка і ачыстка пасеннага і страхавога матэрыялу, забраніраваны фуражны фонд, адрамантаваны і прыведзены ў гатоўнасьць сельска-гаспадарчы інвэнтар. На астатніх калгасах падрыхтоўчая работа закончваецца.

На агульным мітынгу калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі, уключыліся ў барацьбу за сьцяг імя X зьезду Саветаў і выклікалі на сацспаборніцтва Княжыцкі сельсавет.

За апошнія дні ў сувязі з падрыхтоўкай да пробнага выезду і папулярызацыі тэзісаў тав. Якаўлева ў сельсавеце арганізаваўся новы калгас; у старыя ўлілося звыш [illegible] бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Ал. Нёманскі.

Гульня ў адкладаньне

Бягомльскі РВК зусім бюракратычна адносіцца да важнай і неадкладнай справы—земляўпарадкаваньня калгасаў, ня гледзячы на тое, што ў раёне маецца 94 калгасы, якім патрэбна свая ячасова адвесьці ў пэўных мясцох зямлю да веснавой пасеўнай кампаніі, каморнікаў у раёне толькі 6 чалавек.

На падставе дырэктывы НКЗ плян земляўпарадкаваньня калгасаў павінен быць прадстаўлены ў НКЗ 5-й гг. ужо зацьверджаны прэзыдыумам РВК; плян работ на 1931 г. складзен каморнікам Вашкевічам, два разы прадстаўляўся на прэзыдыум РВК, але разгляд яго адкладалі. Першы раз адклалі таму, што парадак дня быў вельмі перагружаны іншымі пытаньнямі, другі раз, што плян папярэдня павінен быць прапрацаваны загадчыкам РайЗА, а трэці раз таму, што загадчык РайЗА Пятровіч ня справіўся яго прапрацаваць да паседжаньня прэзыдыуму.

Некалькі разоў т. Вашкевіч зварочваўся да Пятровіча, каб разам прапрацаваць плян і перадаць яго на разгляд прэзыдыуму, але ня гледзячы на тое, што ўжо прайшоў тэрмін—тав. Пятровіч ад гэтага ўхіляецца.

Дрэнная справа і з забясьпечаньнем каморнікаў спэцвопраткай. На выкананьні работ па земляўпарадкаваньні дрэнна адбіваецца несвайчасовая выдача каморнікам наложанай цёплай спэцвопраткі. Справа гэта цягнецца яшчэ з лістапада 1930 г. НКЗ паведаміў РВК аб тым, што цёплую спэцвопратку каморнікі будуць атрымліваць у спажыўкаапэрацыі раёну. Праз месяц—другая адносіна НКЗ аб тым, што зімовую спэцвопратку каморнікі атрымаюць у Менскім аддзяленьні Белдзяржснабу. Але і да гэтага часу ніхто яе не дае, дзякуючы чаму некаторыя каморнікі, ня маючы адпаведнай спэцвопраткі, ня могуць прадукцыйна працаваць работу.

Зарплата выплачваецца таксама несвайчасова — праз паўтара—два месяцы.

Патрабуем умяшацельства ў гэту справу адпаведных органаў і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці за зрыў падрыхтоўкі да ўдарнай бальшавіцкай вясны.

В. Тэмп.

Плян засеву гародніны трэба выканаць

Нядаўна Гомельскі гарпрафсавет, заслухаў вынікі абсьледваньня становішча прыгарадных гаспадарак і пастанавіў:

Прапанаваць праўленьню ЦРК і райсельпо сумесна з загатоўчымі органамі не пазьней 15 сакавіка поўнасьцю забясьпечыць гаспадарку насеньнем, дзеля чаго дадатковa паслаць брыгаду на раён у складзе ня менш 15 чал. для кіраўніцтва і ўзмацненьня працы па загатоўцы насеньня.

Канстатуючы поўны зрыў свайчасовай вывазкі гною на палі ЦРК, недапушчальныя адносіны да скарыстаньня сваёй цягавай сілы з прычыны адсутнасьці рабочых і прымаючы пад увагу набліжэньне часу псаваньня санная дарогі, прапанаваць праўленьню ЦРК на ўсе 100 проц. скарыстоўваць сваю конную сілу.

Дырэктыва гарпрафсавету ў гэтай галіне ня выканана з боку фабзаўмясцкомаў, таму прапануецца ўсім ФЗМК прасачыць за абавязковым выкананьнем усіх прапаноў.

Праўленьню ЦРК забясьпечыць сталае кіраўніцтва арганізацыяй парніковай гаспадаркі.

Праўленьню ЦРК і сэктару кадраў ужыць тэрміновыя захады да поўнага ўкамплектаваньня сталага кадру рабочых, якіх забясьпечыў нармальную працу ўсяе гаспадаркі на працягу ўсяго году, для чаго безадкладна скончыць у месячны тэрмін пачатае будаўніцтва для рабочых агульных памяшканьняў і прыступіць безадкладна да пабудовы сэзонных памяшканьняў на новых гародных вучастках.

Арганізацыйнаму сэктару ГСПС забясьпечыць мясцком фэрмы прафработнікамі. Рабачкому ў далейшым да біцца ўзьняцьця працдысцыпліны сярод рабочых.

Адкрыўся III Усебеларускі зьезд калгасаў

Учора а 7-й гадзіне ўвечары ў Менскім гарадзкім тэатры адкрыўся III Усебеларускі зьезд калгасаў. На зьезд зьявілася каля 400 дэлегатаў-калгасьнікаў.

Хутка заля тэатру перапоўнілася дэлегатамі. З усіх куткоў БССР сюды зьехаліся калгасьнікі, каб прыняць удзел у абмеркаваньні пытаньняў далейшага будаўніцтва сацыялізму ў краіне Саветаў.

На трыбуне старшыня Белкалгасцэнтру тав. Міцькоў.

— Два з паловай гады таму назад,—кажа тав. Міцькоў у сваёй уступнай прамове,—у БССР быў усяго 1 процант калектывізаваных гаспадарак, а зараз калектывізацыя дасягае 19 процантаў. Калгасы далі высокія паказальнікі работы; звыш 50 проц. таварнага хлеба далі сёлета дзяржаве калгасы.

Зьезд прыступае да выбараў прэзыдыуму. Пад гучныя воплескі ў прэзыдыум запрашаюцца тт. Гей, Чарвякоў, Галадзед, Міцькоў, Рачыцкі, Рыжоў, Калнін, Шаранговіч, Гаруковіч, Палякоў, Стрэле і інш.

У ганаровы прэзыдыум абіраюцца—Палітбюро ЦК УсеКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б.

Ад ураду БССР зьезд вітаў тав. Чарвякоў.

— VI Усесаюзны зьезд саветаў, які нядаўна скончыў сваю работу,—кажа тав. Чарвякоў,—даў нам паказаньне ўзмацніць будаўніцтва фундаманту сацыялізму, даў нам паказаньне больш рашуча і шпарчэй павесьці сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Апорай савецкай улады на вёсцы зьяўляюцца калгасьнікі. Траба яшчэ шырэй разгарнуць калектыўнае будаўніцтва.

Віталі зьезд—ад ЦСПСБ тав. Рыжоў, ад ЦК ЛКСМБ тав. Палякоў.

Чутна вайсковая каманда—«зважай»! Гэта прышлі прывітаць зьезд чырвонаармейцы з Н-скай Самарскай коннай дывізіі і Н-скай Беларускай дывізіі. Гавораць чырвонаармейцы Жаўткоўскі і Эпштэйн, начальнік палітаддзелу Шашакоў.

Уся заля з вялікай увагаю слухае гарачыя прамовы прадстаўнікоў Чырвонай армії.

Далей зьезд вітала дэлегацыя ад заводу «Полымя рэвалюцыі», пасьля чаго была закончана ўрачыстая частка паседжаньня.

Сёньня работа зьезду будзе праходзіць у доме Камасьветы.

Рапартуюць Усебеларускаму зьезду калгасаў

да канца 1931 году давядзем стада сьвінаматак у калгасах да 2000 галоў,

здамо для грамадзкага харчаваньня 2700 сьвіней

Пад сталёвым кіраўніцтвам Ленінскай партыі на тэрыторыі Ельскага раёну маюцца значныя дасягненьні на калектывізацыі бяднацка - серадняцкіх гаспадарак. Замест 5 калгасаў з 70 сем'ямі ў 1929 годзе, зараз у раёне налічваецца **65 калгасаў, якія яднаюць 1600 двароў ці 25 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак раёну.**

У час сталінскага прыліву ў раёне арганізавана 4 новых калгасы, у старыя калгасы ўлілася 151 гаспадарка.

Калгасы Ельшчыны ўжо паказалі перавагу калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай. Прыбыткі калгасьнікаў значна вышэй, чым аднаасобнікаў, аб гэтым сьведчаць зьнікі разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах. Калгасы раёну плянны хлебазагатовак выканалі з перавышэньнем.

Калгасы Ельшчыны маюць жывёлагадоўчы напрамак. У зьвязку з вырашэньнем мясной праблемы, 20 сьвінагадоўчых гаспадарак бяруць на сябе абавязак да канца 1931 году давесьці стада сьвінаматак да 2000 галоў і здаць дзяржаве 2700 галоў адкормленых сьвіней. 7 жывёлагадоўчых калгасаў бяруцца давесьці свае стада да 800 галоў і абавязуюцца здаць дзяржаве 25 тон масла.

Калгасы Ельшчыны пераканаліся ў тым, што тыя формы арганізацыі працы, якія існавалі да гэтага часу, не адпавядаюць сапраўдным запатрабаваньням калгаснай гаспадаркі. Сёлета калгасьнікі поўнасьцю пераходзяць на новыя формы работы з увядзеньнем зьдзельшчыны, шырока разгортваючы ўдарніцтва і сацспаборніцтва.

Да сустрэчы другой бальшавіцкай вясны калгасы Ельшчыны ў асноўным гатовы па такіх мерапрыемствах, як стварэньне насенных фондаў, рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару, складаньне вытворчых плянаў і г. д.

Калгасы Ельшчыны запэўніваюць 3-ці Усебеларускі зьезд калгасаў, што да пачатку другой бальшавіцкай вясны **ўцягнуць у свае рады да 40 проц.** бяднацка-серадняцкіх гаспадарак раёну, зьнішчыць усе існуючыя [illegible]

Калгасьніцы дэлегаты зьезду. Зьлева направа сядзяць—Буяк—калгас «Дубова» Клічаскага р-ну; Ярмаліцкая—калгас «Прагрэс» Слуцкага р-ну; Бруй—калгас «Трактар» Слуцкага р-ну; Стаіць—Громава—калгас імя Дзяржынскага Магілеўскага р-ну.

Будзем і далей змагацца

за калгасны прамфінплян

Пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, садова - гародны калгас «Чырвоны Берег» Аршанскага раёну дабіўся значных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве. Калгас падрыхтаваўся да сяўбы. Плянны сяўбы складзены і зацьверджаны. Запраектавана засеяць 95 га розных гародных культур. Пачалася работа па закладаньні 2500 парніковых рам, а таксама будаўніцтва хлявоў, квасільнага пункту, хавальнікаў для гародніны і інш.

Летась калгас здаў дзяржаве 2 тоны жыта, 2 тоны раньняй бульбы, 19 тон сталовых буракоў, 13 тон цыбулі, 196 тон гуркоў, 345 тон капусты, 21 тону морквы, 46 тон бруквы, 30 тон раньняй капусты, 150 тон яблык. Здадзена 33 галавы рагатай жывёлы на мяса. Калгас за мінулы год здаў 500.000 літраў малака.

Калгас «Чырвоны Берег» у 1930 г. меў 49.225 руб. прыбытку. Сярэдні заработак на кожнага калгасьніка ў год складае 1.400 р., што ў два разы перавышае прыбытак аднаасобнай гаспадаркі.

Усе гэтыя дасягненьні, якіх калгас дабіўся, пераконваюць нас у тым, што толькі праз калектыўную гаспадарку можна палепшыць свой дабрабыт і вызваліць бяднака і серадняка з кулацкай кабалы.

Вітаючы 3-й Усебеларускі зьезд калгасаў, калгас «Чырвоны Берег» запэўнівае зьезд, што і далей будзе рашуча змагацца за выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Мы запэўніваем зьезд, што задачы другой бальшавіцкай вясны выканаем з посьпехам.

Калгасьнікі: **Аўчыньнікаў, Гурэвіч, Рабіновіч, Шьніза, Салдатаў, Рабіновіч Р., Мірончык, Красюр.**

25-га сакавіка—дзень агляду гатоўнасьці МТС

25-га сакавіка т. г. па БССР праводзіцца дзень агляду гатоўнасьці МТС да веснавой сяўбы.

Смотр павінен выявіць на колькі МТС і калгасы, што абслугоўваюцца імі выканалі канкрэтныя задачы, пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Падрыхтоўку і самы агляд трэба не ратварыць у масавую гаспадарча-палітычную кампанію, мабілізуючы вакол МТС калгасьнікаў і бяднацка-серадняцкія масы аднаасобнікаў.

Паказьнікамі гатоўнасьці МТС зьяўляюцца: стан трактароў і прыцэпнага інвэнтара, забясьпечанасьць гаручым і змазачным матэрыялам, падрыхтаванасьць кадраў, давядзеньне вытворчых рабочых плянаў да вучастку, брыгады і асобнага работніка, падрыхтаванасьць культбытавага абслугоўваньня ў полі (грамадзкае харчаваньне, дзіцячыя яслі, санітарнае абслугоўваньне, радыё-ўстаноўкі, падрыхтаванасьць грамадзкіх арганізацый).

Дзень агляду МТС павінен стаць баявым аглядам гатоўнасьці да бальшавіцкай сяўбы, днём змычкі з аднаасобнікам, бяднаком і серадняком.

Брандабоўскі.

Цімашэнка, калгасьніца «Новы Шлях» Чаўскага раёну

НОВЫ ЧАЛАВЕК ПРЫШОУ

Кажухі, сьвіткі і чорныя вопраткі... Гэта не вясковы сход.

Бароды перавісьлі праз бар'ер 2-га і 3-га ярусаў.

Абсівераныя, шурпатыя твары, хусткі сялянскія, зачыны шапкі, маладыя позіркі вачэй пад густымі бровамі...

Старое перамяшалася з маладым.

Нова—ня тое, што гэта ня вёска, не сялянская хата, не вясковая школа.

Дзяржаўны Беларускі тэатр у сваіх сьценах ня першы раз бачыць людзей вёскі.

Нова—ня тое, што гэта Ўсебеларускі зьезд калгасаў. Гэта ўжо трэці зьезд калгасаў БССР.

Новае—ў настрої гэтых людзей, гэтых ударнікаў палёў, гэтых байцоў за суцэльную калектывізацыю. Новае ў лічбах, якія характарызуюць этап.

— Мы завяршаем пабудову сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне...

— 24 эскадроны сталёвай коньніцы МТС на БССР...

Новае ў лічбах, якія ў сваім уступным слове дэманструе старшыня Калгасцэнтру тав. Міцькоў.

— 50 процантаў усіх таварных лішкаў сельскае гаспадаркі ўжо ў мінулым годзе далі калгасы...

Калгасы Савецкага саюзу,—кажа тав. Чарвякоў,—за апошні год далі столькі таварных лішкаў, колькі давалі абшарніцкія маёнткі да вайны...

Новае ў тэмпах сацыялістычнага будаўніцтва, у арганізацыі і мэтадах працы, аб якіх гаворыць старшыня ЦСПСБ тав. **Рыжоў.**

Новае—ў маладым запале, якім дыхае прамова сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Палякова.

— Змагацца з перагібамі!.. Даёш суцэльную!..

Глядзіш на шырокаплечую фігуру ўласьніка шырокай барады, што красуецца ў другім ярусе, глядзіш на сялянку, асьветленую «іконітэрамі» за сталом прэзыдыуму ў густой і яркай чырвані сьцягоў і ўспамінаеш—дзе я бачыў гэтых знаёмых мне людзей?..

1919 год... Сход. Гарачыя прамовы—за што мы змагаемся, што мы павінны пабудаваць...

І такая-ж барада з якой-небудзь вёскі Нялаўкі, такая-ж хустка з набракшымі ад сьлёз хвастамі ў такт ківаецца на словы прамоўцы.

— Будзе... дадзім... пабудуем...

Паказ, сапраўдныя рэальныя дасягненьні—вось што новае набыта ў наш гаспадарчы балянс за 12 год, якія аддзяляюць III Ўсебеларускі зьезд калгасаў ад 1919 году.

Гмахі прадпрыемстваў, жалезная хата індустрыялізацыі, гіганты саўгасы і калгасы, рост дабрабыту, рост нашай сілы, узмацненьне абароназдольнасьці краіны, бурныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва—вось што сёньня апраўдвае ўпартасьць нязломных бальшавікоў, вось што аплуе за генэральную лінію партыі Леніна.

— Зьезд прышлі прывітаць ад імя Чырвонай армії...

Яшчэ ў залі няма стромкіх фігур байцоў Чырвонай, зацягнутых у шэрыя шынэлі, а ўжо чоткі, чаканены крок настарожнае прадстаўнікоў сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі...

Барада з другога ярусу ўжо не глядзіць сфінксам. Яна перагнулася праз бар'ер, а рукі гарматамі шлюць беглы агонь воплескаў.

Млын пашоў... І лемяшы ёсьць..: Нават трактар застракатаў у калгасе..:

Высахлі хвасты хусткі ад сьлёз... На вачох калгасьніцы новы бляск.. Просяцца новыя сьлёзы, калі слухаеш прывітаньне вартаўнікоў межаў.

— У нашай дывізіі імя ангельскага пралетарыяту 70 процантаў калгасьнікаў. Мы—на 100 процантаў ударнікі. Мы дапаможам у барацьбе за суцэльную...

Замах у Японіі на нашага гандлёвага прадстаўніка, правакацыя ў Румыніі—прымушаюць нас зорка сачыць за ворагам. Мы гатовы даць па руках, калі ворат асьмеліцца пасягнуць на цэласьць нашых межаў...».

Чырвоная стаць сталёвай сьцяной на варце завaёў Кастрычніка. Можна гаварыць упэўнена аб выкананьні пляну трэцяга рашаючага, аб другой калгаснай...

Вось чаму бароды, хусткі, сьвіткі, кажухі, чорныя вопраткі шматлікая аўдыторыя прадстаўнікоў сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі разам з прадстаўнікамі сацыялістычнай прамысловасьці дыхаюць адным духам, гараць адным полымем, полымем энтузіязму, агнём барацьбы за суцэльную калектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва як класы, за завяршэньне бальшавіцкімі тэмпамі падмурку сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым...

Адчуваецца, што ў жыцьцё савецкай краіны ўпэўненым крокам прышоў новы чалавек, прышлі мільёны, якія пановаму будуць змагацца за генэральную лінію ленінскай партыі, за новую бесклясавую грамаду, за новае сацыялістычнае жыцьцё.

П. Ш.

Да сяўбы—гатовы

Калгас «1-га мая», Кручанскага с.-с., Крутлянскага раёну, арганізаваўся ў 1928 годзе. У пачатку калгас яднаў толькі 14 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, і меў 180 га. Зараз у калгасе знаходзіцца 31 гаспадарка, плошча зямлі павялічана да 910 га.

Разьмеркаваньне ўраджаю праведзена да 1-га студзеня г. г. Гэта разьмеркаваньне паказала перавагу калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай.

У працягу 2-х год калгас значна павялічыў сваю маёмасьць.

Калгас «1-га мая» актыўна рыхтуецца да веснавой сяўбы. Пасевы пад ярыну будуць пашыраны на 18 проц супроць мінулага году. С.-г. інвэнтар адрамантаваны на 90 проц., насеньны і страхавы фонды створаны поўнасьцю, насеньне ачышчана на ўсе 100 проц. Створаны таксама фуражна-кармовыя фонды. Калгасныя коні маюць добры догляд. Да выхаду ў поле калгас гатоў.

Старшыня калгасу Шабусёў.

Па дакладу т. Рачыцкага і т. Міцькова аб саўгасным будаўніцтве і калектывізацыі Беларускай ССР

Пастанова X-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў

1. Перыяд з часу IX-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў характарызуецца вялікімі дасягненьнямі ў галіне індустрыялізацыі краіны і на гэтай аснове сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Звыш 30 процантаў усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак Савецкага Саюзу ахоплена калектывізацыяй. У нязьлькі раз павялічылася колькасьць саўгасаў. Арганізаваны новыя буйныя фабрыкі зерня, мяса-малочных прадуктаў і тэхнічных культур.

На фоне агульнага росту народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу, рабочая клясa Беларускай ССР у саюзе з асноўнымі масамі сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дабілася значных посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Апошнія гады зьяўляюцца гадамі вялікага пералому ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пасеўная плошча па Беларускай ССР за апошнія 2 гады павялічылася на 9,5 проц. Калектывізацыяй ахоплена на 1 студзеня 1931 году—15 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак Беларускай ССР і да X Усебеларускага Зьезду Саветаў—17,6 проц. Плошча пад саўгасамі павялічылася амаль у 3,5 раз (з 115.000 га у 1928 г. да 380.000 га на 1 студзеня 1931 г.). Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі дае зараз звыш 30 проц. усёй таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі і агульная валавая прадукцыя сацыялістычнага сэктару з 15,8 млн. рублёў у 1928-29 г. узрасла да 144,4 млн. руб. у 1930 г.

2. Гэтыя дасягненьні ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі сталі магчымымі толькі дзякуючы правільнай Ленінскай палітыцы камуністычнай партыі, накіраванай на індустрыялізацыю краіны, на ўзмацненьне кіруючай ролі прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы, бо «толькі буйная машынная прамысловасьць і пераняцьне яе ў земляробства ёсьць адзіная эканамічная база, база сацыялізму, адзіная база для посьпяховай барацьбы за пазбаўленьне чалавецтва ад ярма капіталу». (Ленін).

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны і дапамога Беларускай ССР з боку рабочай клясы ўсяго Савецкага Саюзу, забясьпечылі маючыяся дасягненьні і даюць падставы і магчымасьць да ператварэньня малаграмотнай, распыленай у мінулым, аднаасобнай сельскай гаспадаркі ў буйную сацыялістычную гаспадарку.

3. Разгорнутае будаўніцтва сацыялізму праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы, іх выпясьненьне, правядзеньне палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі выклікае шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў.

У Беларускай ССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе супраціўленьне кулацтва мерапрыемствам, якія праводзяцца партыяй і ўрадам, выражаецца ня толькі ў спробах зрыву сацыялістычнага будаўніцтва (калектывізацыі, загатовак і г. д.), але і ў тэарытычным афармленьні сваіх шкодных растаўратарскіх ідэй праз сваіх агентаў Прышчэпаў, Смолч, Гарэцкі, Кісьлякоў і інш.). Кулацтва праз сваіх агентаў імкнулася сарваць палітыку камуністычнай партыі, накіраваную на індустрыялізацыю краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Кулацка - капіталістычныя элементы сваё супраціўленьне правядзеньню палітыкі дыктатуры пралетарыяту ў Беларускай ССР праводзілі ў напрамку затрыманьня індустрыялізацыі краіны, зрыву калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падтрыманьня кулацтва праз утварэньне кулацкай і адрубнай гаспадаркі. Разьвіцьцё сельскай гаспадаркі яны імкнуліся накіраваць праз індывідуальную дробную гаспадарку ў той час, як «разьвіцьцё дробнай гаспадаркі, ёсьць разьвіцьцё дробна-буржуазнай, ёсьць разьвіцьцё капіталістычнай»—(Ленін).

4. Клясавая барацьба ўнутры краіны і супраціўленьне кулацтва сацыялістычнаму будаўніцтву знайшло свой адбітак і ў правым ухіле ўнутры партыі. Правыя апартуністы, якія імкнуліся сьцягнуць партыю з правільнай ленінскай лініі і якія імкнуліся да затрыманьня тэмпаў індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі праз саўгасы і калгасы, зьяўляюцца агентурай клясавага ворага ўнутры камуністычнай партыі.

«Перамога правага ўхілу ў нашай партыі адзначала-б значнае ўзмацненьне капіталістычных элементаў у нашай краіне... перамога правага ўхілу ў нашай партыі адзначала-б нарастаньне ўмоў неабходных для аднаўленьня капіталізму ў нашай краіне» (Сталін)....

Перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага, а таксама ўядучы барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі, права-«лявацкім» блёкам і прымірэнчымі адносінамі да іх, партыя пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК вядзе краіну дыктатуры пралетарыяту на шляху пасьпяховага пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

5. Правядзеньне правільнай ленінскай палітыкі, пашырэньне тэхнічнай базы ў краіне і ў зьвязку з гэтым узмацненьне вытворчай эмычкі рабочай клясы з асноўнымі масамі сялянства, падвышэньне кіруючай ролі пралетарыяту ва ўсёй народнай гаспадарцы, забясьпечылі паварот асноўнай масы сялянства да калектывізацыі, усьлед за батраком і бедняком пайшоў у калгасы і серадняк.

Пасьпяховае наладжваньне і разгортваньне работы ў існуючых сельска - гаспадарчых калектыўных аб'яднаньнях ня толькі замацавалі дасягнутыя посьпехі калектывізацыі, але і стварылі ўмовы новага ўздыму калгаснага руху.

Ўздым калгаснага руху такім чынам зьяўляецца вынікам дасягнутых калгасамі посьпехаў у мінулым. «Шлях калгасаў ня ёсьць ужо шлях невядомы і недасьледаваны. Ён дасьледван і праверан на тысячы спроб самымі сялянскімі масамі. Дасьледван і ацэнен, як новае, што дае сялянству вызваленьне ад кулацкай кабалы, ад патрэбы, ад цэмры» (Сталін).

Па гэтаму шляху ідуць ўсё новыя і новыя масы бядняцка - сераднякіх гаспадарак.

Гэты ўздым і тое, што самі калгасьнікі вядуць актыўную барацьбу за ўцягненьне ў калгасы новых мас аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак, забясьпечвае даведзеньне калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларускай ССР у 1931 годзе да 45 проц. і завяршэньне ў асноўным калектывізацыі ўсіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак да канца пяцігодкі.

6. Даведзеньне ахопу калектывізацыяй 45 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак Беларускай ССР у 1931 г. і 30 проц. у вясновую пасеўную кампанію патрабуе разгортваньня шырокай работы вакол задач калектывізацыі з боку ўсіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, бязьлітаснай барацьбы з правапартыйнымі настроямі самацёку ў калгасным руху, якія існуюць у значнай частцы раёнаў і яшчэ больш рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы, пасьлядоўнага правядзеньня палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Зьезд Саветаў адзначае, што сучасныя тэмпы калектывізацыі зьяўляюцца зусім недастатковымі ў той час, калі існуюць усе маждівасьці іх значна павялічыць. Зьезд заклікае ўсю пралетарскую грамадзкасьць і абавязвае ўсе савецкія ўстановы і арганізацыі разгарнуць шырокую работу па падвышэньні тэмпаў калектывізацыі і абавязковым выкананьні намечаных у справе калектывізацыі задач на аснове захаваньня поўнасьцю марксыцка-ленінскіх прынцыпаў у калгасным руху. Усю работу па калектывізацыі неабходна разгортваць вакол арцелі, як асноўнай формы калгаснага руху на даным этапе. Разам з гэтым павінна быць узмоцнена работа па арганізацыі першапачатковых таварыстваў, як пераходнай формы да арцелі.

7. У выжку правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дасягнуты значныя посьпехі ў калектывізацыі бядняцка - сераднякіх мас нацыянальных вёсак і населішчаў. Процант калектывізацыі працоўных нацыянальных меншасьцяй вышэй, чым агульны сярэдні процант калектывізацыі Беларускай ССР. На 1 лістапада 1930 году ў Беларускай ССР было 306 яўрэйскіх, 86 польскіх, 16 латыскіх, 3 літоўскіх калгасы. Гэта яшчэ раз пацьвярджае правільнасьць ленінскай нацпалітыкі, якая праводзіцца кампартыяй.

Зьезд Саветаў прапануе ўсім савецкім, гаспадарчым і калгасна-каапэрацыйным арганізацыям яшчэ больш разгарнуць работу па ўцягненьні ў калгасы бядняцка - сераднякіх мас нацменшасьцяй.

8. Асноўным і рашаючым пытаньнем у калгасным будаўніцтве, зьяўляецца правільная арганізацыя працы і гаспадаркі ў калгасах, арганізацыя правільнага вучоту працы і разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю.

Зьезд з усёй рашучасьцю абавязвае ўсе савецкія і калгасныя органы забясьпечыць абавязковы пераход усіх калгасаў:

а) на ўлік працы ў працаднёх з пераводам на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, распаўсюджваньне зьдзельшчыны, сацспаборніцтва, ударніцтва і брыгадны мэтад;

б) на падвышэньне працоўнай дысцыпліны і правядзеньне рашучай барацьбы з разгільдзяйствам і выпадкамі лодарыцтва.

Зьезд абавязвае арганізаваць разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю выключна па колькасьці і якасьці затрачанай кожным калгаснікам працы ні ў якім разе не дапускаючы разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю па едакох, паёх і іншых крыніцах, апрача асноўнага прынцыпу—гэта па колькасьці і якасьці затрачанай працы.

9. Зьезд адзначае, што саўгасы, як гаспадаркі пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу, адыгрываюць вядучую ролю ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. Яны зьяўляюцца ўзорам буйнай гаспадаркі ў земляробстве і рацыянальнага скарыстаньня сродкаў вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы.

Адабраючы мерапрыемствы ўраду, накіраваныя на павялічэньне ўдзельнай вагі маючыхся саўгасаў і арганізацыю новых, Зьезд прапануе і ў далейшым праводзіць мерапрыемствы на далейшае пашырэньне ўдзельнай вагі саўгасаў, накіраваўшы асаблівую ўвагу на іх спэцыялізацыю, асабліва ў напрамку прамысловай жывёлагадоўлі і тэхкультур. У цэнтры ўвагі ўсіх саветаў, саўгасна-калгаснай сыстэмы, рабочых саўгасаў і калгасаў па вёсна стаць задача па палепшаньні якасных паказчыкаў працы саўгасаў і калгасаў (павялічэньне прадукцыйнасьці і таварнасьці жывёлагадоўлі, павялічэньне ўраджайнасьці і зьнижэньне сабекошту, максымальнае скарыстаньне ўсіх сродкаў вытворчасьці і рашучае павялічэньне вытворчасьці працы. Зьезд ухваляе пастанову Ўраду аб даведзеньні ў 1931 г. плошчы пад саўгасамі да 550.000 га.

Зьезд зварочвае асаблівую ўвагу на арганізацыю працы ў саўгасах, на забясьпячэньне іх рабочай, асабліва кваліфікаванай сілай і на ўзьнікьце вытворчасьці працы.

Саўгасы ў сваёй далейшай рабоце павінны ўстанавіць значна большую гаспадарчую сувязь з калгасамі і ўзмацніць сваю вядучую ролю ў адносінах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

10. Адным з важнейшых фактараў разгортваньня калгаснай і саўгаснай вытворчасьці, узьняцьця прадукцыйнасьці працы, падвышэньня таварнасьці зьяўляецца правядзеньне рэжай спэцыялізацыі калгасаў і саўгасаў у напрамку вядучых галін сельскай гаспадаркі. Улічваючы, што аднэй з асноўных задач разьвіцьця сельскай гаспадаркі Беларускай ССР зьяўляецца праблема жывёлагадоўлі і асабліва сьвінагадоўлі, якая можа быць вырашана толькі па лініі сацыялістычнага сэктару і што вырашэньне гэтай праблемы ў першую чаргу павінна ісьці праз стварэньне жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, Зьезд Саветаў адзначае, што справа арганізацыі жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў і калгасаў, справа арганізацыі жывёлагадоўчых гаспадарак павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсёй работы па калгаснаму і саўгаснаму будаўніцтву. Заданьне партыі і ўраду паставіць у 1931 годзе 150.000 сьвінаматак у калгасах і 75.000 у саўгасах, патрабуе вялікай увагі ўсіх арганізацый да сьвінагадоўлі, бо толькі праз утварэньне прамысловай сьвінагадоўлі можна забясьпечыць хутчэйшае вырашэньне мясной праблемы.

У сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі ў 1931 годзе павінна быць сканцэнтравана ня менш 50 проц. усяго пагалоўя буйнай рагатай жывёлы. Усё гэта патрабуе вялікай увагі да спэцыялізаваных жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў.

Зьезд Саветаў з усёй рэзкасьцю ставіць пытаньне падвышэньня прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі праз шырокае разгортваньне мерапрыемстваў па мэтызацыі з найбольш высока-прадукцыйнымі пародамі буйнай рагатай жывёлы і сьвіней, а таксама барацьбы са стратамі, што патрабуе карэннай рэарганізацыі працы вэтэрынарна-заатэхнічнага пэрсаналу, поўнага выкананьня заатвэтэрынарнаму, мабілізацыі вакол гэтых задач да актыўнага ўдзелу шырокіх рабочых мас саўгасаў і калгасьнікаў.

11. У зьвязку з тым, што маючаяся кармавая база ў Беларускай ССР далёка не забясьпечвае вырашэньне задач пастаўленых партыяй і ўрадам у галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі і што недахоп кармоў ужо зьяўляецца тормазам далейшага пашырэньня стада ў саўгасах і калгасах, Зьезд Саветаў з усёй сілай падкрэсьлівае неабходнасьць пашырэньня кармавой базы і якаснага яе палепшаньня.

Зьезд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР спэцыяльна разглядзець і вырашыць пытаньне аб будаўніцтве торфападсьцілачных прадпрыемстваў і пашырэньні праграмы вырабу торфянога подсьцілу да патрэбных у 1931 г. разьмераў, каб вызваліць дадаткова кармавыя рэсурсы, што будзе садзейнічаць падвышэньню ўраджайнасьці.

Надыходзячая вясеньняя пасеўная кампанія павінна зьявіцца кампаніяй рашучага пералому ў справе пашырэньня і палепшаньня кармавой базы праз абавязковае выкананьне пляну пасеву пад кармавымі травамі, корань плодамі, сілосными культурамі, палепшаньня сенажацяй і выпасаў. У 1932 г. для павялічэньня кармавой базы, трэба шырока правесьці кампанію па сілаваньні каромў.

12. Адзначаючы нездавальняючы ход разгортваньня насеннаводнай справы ў Беларускай ССР, замену чыстагатунковым насеньнем простага, забясьпечаньне пашыраючайся з кожным годам пасеўнай плошчы насеньнем, асабліва сеяных траў, кармавых і гародніх корнеплодаў, Зьезд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР забясьпечыць поўнае выкананьне пляну і намечаных мерапрыемстваў па вытвару чыстагатункова насеньня праз выдзяленьне спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў. Абавязаць усе саўгасныя і калгасныя арганізацыі разгарнуць вытвар насеньня для забясьпечаньня сваіх патрэб.

13. Зьезд Саветаў лічыць неабходным, каб лепшыя ўзоры сацыялістычнай вытворчасьці, асабліва па лініі жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, усямерна падтрымліваліся як самой сыстэмай арганізацыі гаспадаркі і працы ў саўгасах і калгасах, так і шляхам стварэньня спэцыяльных фондаў, як рэспубліканскага, так і ў раёнах для прэміраваньня за высокаякасныя паказчыкі працы і для аказаньня дадатковай дапамогі перадавым узорным гаспадаркам.

Зьезд патрабуе ад усіх саветаў, раёных выканаўчых камітэтаў, зямельных і калгасна - каапэрацыйных органаў, поўнага выкарыстаньня ўстаноўленых ільгот і палёгак бядняцка-сераднякіцкім гаспадаркам, якія ўступаюць у калгасы.

14. Выходзячы з марксыцка-ленінскага палажэньня аб тым, што высока-вытворчай можа быць толькі буйная гаспадарка, Зьезд Саветаў прапануе працягваць работу па далейшым узбуйненьні дробных саўгасаў і калгасаў, якія-б забясьпечылі найбольш поўнае скарыстаньне складаных сельска-гаспадарчых машын.

15. Адзначаючы нездавальняючае выкананьне пляну будаўніцтва прадпрыемстваў па перапрацоўцы прадуктаў і сыравіны сельскай гаспадаркі, Зьезд Саветаў прапануе Ўраду Беларускай ССР распрацаваць і ажыцьцявіць шэраг практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні будаўніцтва па казаных прадпрыемствах.

Надаючы вялікае значэньне будаўніцтву ільнапрацоўчых заводаў, Зьезд Саветаў абавязвае ўсе савецкія і гаспадарчыя арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне пляну будаўніцтва ільнапрацоўчых заводаў, вызначаных на 1931 год.

16. Разгортваньне буйных сацыялістычных гаспадарак патрабуе поўнага выкарыстоўваньня дасягненьняў навукі і навейшай тэхнікі. Аднак, Зьезд Саветаў канстатуе, што да гэтага часу навукова-дасьледчыя ўстановы ў галіне сельскай гаспадаркі замест таго, каб дапамагаць практыцы, значна адстаюць ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Зьезд даручае ўраду Беларускай ССР на працягу бягучага году дабіцца рашучага пералому ў справе набліжэньня навукова - дасьледчай справы да вытворчасьці (праз пастаноўку масавых досьледаў у саўгасах і калгасах) і абслугоўваньня ёю сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

17. За перыяд пасьля IX-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў у справе мэханізацыі сельскай гаспадаркі Беларускай ССР маюцца вялізарныя дасягненьні. Калі ў 1928 г. на гектар плошчы прыходзілася машын і сельска-гаспадарчых прыладаў на 5,6 руб., дык у 1930 г. на 10,3 руб. Колькасьць трактароў узрасла з 173 у 1929 г. да 793 трактароў на 1 студзеня 1931 г. У 1931 годзе трактарны парк будзе даведзен да 2.300 трактароў. Усяго ў БССР у 1931 г. будзе працаваць 25 машына-трактарных станцый, якія ахопяць сваёй працай плошчу каля 500 тысяч га.

Прыдаючы выключна важнае значэньне машына-трактарным станцыям, Зьезд Саветаў прапануе ўсім савецкім, калгасна-каапэрацыйным органам разгарнуць шырокую палітычна-масавую працу вакол будаўніцтва машына-трактарных станцый, вядучы рашучую барацьбу з недааценкай іх арганізуючай ролі ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Зьезд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР і абавязвае ўсе раённыя выканаўчыя камітэты раёнаў дзейнасьці машына-трактарных станцый поўнасьцю стварыць усе неабходныя ўмовы для пасьпяховага будаўніцтва машына-трактарных станцый і забясьпечыць больш высокія тэмпы калектывізацыі ў раёнах іх дзейнасьці чым у астатніх раёнах рэспублікі.

18. Надыходзячая вясеньняя пасеўная кампанія мае выключнае палітычна-гаспадарчае значэньне, ад выкананьня праграмы якой будзе залежаць пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады. Выкананьне праграмы другой бальшавіцкай вясны, трэцяга рашаючага году пяцігодкі, будзе залежаць выключна ад таго, у якой меры саўгасы і калгасы мабілізуюцца вакол намечаных вытворчых заданьняў.

Задачы вясеньняй пасеўнай кампаніі могуць быць з поспехам выкананы толькі пры актыўным удзеле савецкіх органаў і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці пры поўным уцягненьні рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіцкага сялянства пры рашучай барацьбе з клясавым ворагам—кулацтвам, які ўжывае і будзе ўжываць усе захады да зрыву намечаных плянаў.

Зьезд Саветаў даручае ўсім савецкім органам і калгасна - каапэрацыйным арганізацыям, праводзячы ўсю падрыхтоўчую работу па вясновай пасеўнай кампаніі пад знакам калгаснага прыпіву, увязваючы гэту асноўную задачу з правядзеньнем кампаніі, не дапускаючы ігнараваньне індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі, а наадварот забясьпечыць поўнае выкананьне засеўных плянаў, намечаных да правядзеньня ў аднаасобных гаспадарках. Уся праца па правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі павінна быць увязана з падрыхтоўкай уборачнай кампаніі і заключаць у сабе ўсе неабходныя элементы, якія-б забясьпечылі пасьпяховасьць і своячасовасьць правядзеньня ўборкі ўраджаю.

19. Адзначаючы асаблівае значэньне будаўніцтва ў сацыялістычным сэктары як прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельска-гаспадарчай сыравіны, так і гаспадарчага будаўніцтва (сьвінарнікі, скотнікі) і нездавальняючае выкананьне будаўнічай праграмы ў мінулым, Зьезд Саветаў даручае ўсім савецкім і калгасна-каапэрацыйным арганізацыям забясьпечыць поўнае выкананьне будаўнічай праграмы, вызначанай на 1931 год з максымальнай мабілізацыяй і выкарыстаньнем мясцовых унутраных рэсурсаў будаўнічых матар'ялаў.

Адначасова Зьезд Саветаў, зварочвае ўвагу ўраду Беларускай ССР неабходнасьць больш шпаркай мэханізацыі вытворчых працэсаў і будаўніцтва ў саўгасах і калгасах, асабліва жывёлагадоўчых гаспадарак, для чаго неабходна прадугледзець пашырэньне вытворчасьці абсталяваньня для мэханізацыі жывёлагадоўчых гаспадарак (пераапрацоўка кармоў, запарнікі, пад'ездныя шляхі і інш.).

20. Культурна - бытавое абслугоўваньне саўгасаў і калгасаў, з кожным годам палепшаецца, аднак, яно яшчэ адстае ад тэмпаў росту буйных сацыялістычных гаспадарак і ўзросшых запатрабаваньняў рабочых і калгасьнікаў. Зьезд Саветаў лічыць неабходным зьвярнуць больш увагі на культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых саўгасаў і шырокіх мас калгасьнікаў, выходзячы з таго, што бяз узьнікьцця культурнага ўзроўню немагчыма пасьпяхова ўзьняць і разгарнуць гаспадарку саўгасаў і калгасаў.

Зьезд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР распрацаваць шэраг практычных мерапрыемстваў (будаўніцтва школ, пляцовак, ясьляў, сталовак, мэд пунктаў і іншых) па палепшаньні абслугоўваньня рабочых саўгасаў і калгасьнікаў і асабліва такіх культурна-бытавых мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць больш шырокае ўцягненьне жанчын у вытворчасьць.

21. Далейшы рост сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы праз утварэньне буйных савецкіх і калектыўных гаспадарак упіраецца ў пытаньне забесьпячэньня іх кіруючымі і тэхнічнымі кадрамі. Марудныя тэмпы падрыхтоўкі кадраў у мінулым і прарывы, якія зьвязаны са шкодніцкай дзейнасьцю асобных груп спэцыялістых, патрабуюць максымальнай увагі да справы падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў спэцыялістых, якія-б былі здольны стаць арганізатарамі буйнай сацыялістычнай вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы. Зьезд Саветаў даручае ўраду Беларускай ССР пашырыць сетку вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, а таксама курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў масавай кваліфікацыі да такіх раёў мераў, якія-б забясьпечылі патрэбы саўгасаў і калгасаў. Адначасова з гэтым Зьезд Саветаў зварочвае ўвагу на лепшае скарыстаньне і разьмеркаваньне маючыхся спэцыялістаў у адпаведнасьці са спэцыялізацыяй раёнаў.

22. Замацаваньне дасягнутых посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і выкананьне праграмы, вызначанай на трэці рашаючы год пяцігодкі, які завяршае пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, патрабуе яшчэ большага згуртаваньня рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас сялянства вакол камуністычнай партыі, якая вядзе краіну дыктатуры пралетарыяту да канчатковай перамогі сацыялізму.

Старшыня Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў **А. Чарвякоў.**

Сакратар Х-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў **А. Хацкевіч.**

28 лютага 1931.
гор. Менск.

Неапублікаваныя дакументы Леніна

Ліст У. І. Леніна аб рабоце дзяржтрэста ў на гаспадарчым разьліку

Ніжэйпублікуемы дакумант прадыктаваны Леніным па тэлефону з Горак 1-га лютага 1922 году. Ліст напісаны ў сувязі з фінансавым крызісам, выкліканым вялізарным ростам эмісіі на працягу асеньніх месяцаў 1921 году. Гэты крызіс адбіўся на дзейнасьці дзяржаўных трэстаў, якія ня здолелі перабудаваць сваю работу на пачатках гасразьліку, і выразіўся ў прыпыніну плацяжоў радам дзяржорганаў.

Пытаньне аб фінансавым крызісу асьветлена на 11 зьезьдзе партыі, у спэцыяльным дакладзе (гл. 11 зьезд РСП(б). Стэнаграфічная справаздача стар 275-276; 295-298). Дакумант апублікоўваецца ўпяршыню па тэксту, надрукаваным на машынцы на блянку старшыні Савету Народных Камісараў.

Інстытут Леніна.

1-га лютага 1922 году.

Таварышу Сакольнікаву. Копія тав. Цюрупе і тав. Кржыжаноўскаму.

Вы мне сказалі, што ненаторыя наныя трэсты могуць аказацца бяз грошай і прасіць нас ультыматыўна аб тым, каб мы іх нацыяналізавалі. Я думаю, што трэсты і прадпрыемствы на гаспадарчым разьліку заснаваны іменна для таго, каб яны самі адказвалі, і прытым цалкам адказваюць за бясстратнасьць сваіх прадпрыемстваў. Калі гэта аказваецца імі не дасягнута, дык, на мой погляд, яны павінны прыцягвацца да суду і нарацца ў сила блянку старшыні Савету Народных Камісараў.

Інстытут Леніна.

1-га лютага 1922 году.

Таварышу Сакольнікаву. Копія тав. Цюрупе і тав. Кржыжаноўскаму.

Вы мне сказалі, што ненаторыя наныя трэсты могуць аказацца бяз грошай і прасіць нас ультыматыўна аб тым, каб мы іх нацыяналізавалі. Я думаю, што трэсты і прадпрыемствы на гаспадарчым разьліку заснаваны іменна для таго, каб яны самі адказвалі, і прытым цалкам адказваюць за бясстратнасьць сваіх прадпрыемстваў. Калі гэта аказваецца імі не дасягнута, дык, на мой погляд, яны павінны прыцягвацца да суду і нарацца ў сила

дзе ўсіх членаў праўленьня доўгат новым пазбаўленьнем волі (можа б з дапасаваньнем пасьля пэўнага т ну ўмоўнага аслабаненьня), канфіс цыі ўсяе маемасьці і г. д. Калі стварыўшы трэсты і прадпрыемствы гаспадарчым разьліку, ня зможам лавым нупцоўскім спосабам забясп чыць цалкам свае інтарэсы, дык будзем набітымі дурнямі.

Сачыць за гэтым павінен ВСНГ, яшчэ больш Наркамфін праз Дзя банк і праз спэцыяльных інспэктар бо іменна НКФ ня будучы зацінаў ным непасрэдна, абавязан устанав сапраўдны рэальны кантроль і п верку.

Ленін

Ліст Леніна аб задачах каапэрацыі ва ўмовах новай эканамічнай паліты

Публікуемы ніжэй ліст Леніна зьяўляецца адказам на ліст члена праўленьня Цэнтрасаюзу тав. Ціхаміра ад 22 лютага 1922 г. У адказным лісьце Ўладзімер Ільліч дае агульную ўстаноўку аб задачах каапэрацыі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі. Яшчэ ў сьнежні 1918 году Ўладзімер Ільліч адзначаў, што сацыялістычная грамадзкасьць павінна зьяўляцца «адзіным каапэратывам працоўных». Гл. прамову на III зьезьдзе рабочай каапэрацыі, (Творы Леніна, т. 23, старонка 416), на што спасылаецца ў сваім лісьце Ціхаміраў. Кажучы ў лісьце аб тым, што «не каапэрацыю трэба прыстасоўваць да нэпа, а нэп да каапэрацыі», Ленін тым самым падкрэсьлівае небясьпеку забыцьця каапэрацыяй яе ролі ў справе стварэньня сацыялістычнай грамадзкасьці, небясьпеку падпраддаваньня вузкагандлярскім мэтам і па сутнасьці папярэджвае ад урываньня ў дзейнасьць каапэрацыі «нейкага нэпманаўскага духу» як выразіўся т. Сталін у палітсправаздачы XVI зьезду партыі. Друкуецца па рукапісу.

Інстытут Леніна.

1-га сакавіка 1922 году (копія Цюрупе і Молатаву).

Тав. Ціхаміраў.

На мой погляд ніякіх зьмен непатрэбна. Не каапэрацыю трэба прыстасоўваць да нэпа, а нэп да каапэрацыі. Паралель з прафсаюзамі няправільная. Бліжэй была-б да сапраўднасьці паралель з саветамі. Пакінуць пабудову мінулую. Усю ўвагу і ўсе сілы зьвярнуць да падбор людзей (гэта ў нас дрэнна) і на перамогу над прыватным гандлем. Усё ня гэта. Ніякіх перабудоў. Ці ёсьць практычныя дасягненьні? Баюся, што няма. Зварот IX—1, X—3, XI—6, XII—10 мільёнаў даваенных рублёў за адзін квартал 1922 году. Процанты расходаў? Слабее ці мацнее каапэрацыя?

З камуністычным прывітаньнем Ленін.

УВАГА: 1. Ліст В. А. Ціхаміра ва ад У. І. Леніна зводзіўся да наступнага: што неабходна партыйная дырэктыва аб новых формах каапэрацыі і прыстасаваньне апарату каапэрацыі да нэпа. Барацьба раду плыняў каапэрацыі можа п весьці да адрыву каапэрацыі партыі, ад дзяржавы, да забыцц той яе задачы, якая фармулява Леніным, які ўказаў, што «дзяр ва павінна ператварыцца ў адзі каапэратыў працоўных».

2. Гэты абзац ліста зьяўляец адказам на наступнае месца лі Ціхаміра: «ёсьць бязумоўна і но добрае сярод усіх поглядаў (я выказваліся на праўленьні Цэнт саюзу—Рэдакцыя)—гэта парыў практычнай перабудовы апара (каапэрацыі—Рэдакцыя) з мэт прыстасаванасьці яго да нэпа».

3. Гэтыя словы адносяцца да ступнага месца ліста Ціхаміра «абарона клясавых інтарэсаў ра чае клясы, новыя задачы праф юзаў, высоўваюць пытаньне аб ст рэньні клясавай рабочай каапэр цыі і вылучэньня яе з агульн спажывецкай каапэратыўнай сыст мы на ўсіх пунктах».

4. Табліца абазначае зваро Цэнтрасаюзу ў верасень, кастры нін, лістапад і сьнежань 1921 го

Нямецкія рэакцыянэры ў сваіх імпэрыялістычных махінацыях карыстаюцца „расійскім козырам“

Выступленьне камдэпутата Штэкера ў нямецкім рэйхстагу

БЭРЛІН, 19. У рэйхстагу ў спрэчках па бюджэту міністэрства замежных спраў выступіў камуністычны депутат **Штэкер.**

Адзначыўшы тое, што рэйхстат зацьвердзіў асыгнаваньне на пабудову браняносцаў, тав. Штэкер працягваў:

«Мы, камуністы, вядзем барацьбу супроць розных імпэрыялістычных узброеньняў. Мы вядзем гэтую барацьбу адзіным фронтам з французкімі, англійскімі, італьянскімі і інш. таварышамі. Сацыял-дэмакраты, наадварот, робяць тое самае ва ўсіх краінах, якраз у адваротным кірунку. Яны—найлепшая апора для падрыхтоўкі ўзброеньняў ва ўсіх капіталістычных краінах».

Потым тав. Штэкер перайшоў да характарыстыкі адносін паміж **Нямеччынай і Савецкім саюзам.**

«У мінулую нядзелю,—сказаў Штэкер,—лідэр народнай партыі **Дынгельдзей,** выступаючы ў Мюнхене, сказаў літаральна наступнае: «Французкія дзяржаўныя дзеячы павінны былі-б зразумець расійскую небясьпеку, якая пагражае Эўропе ў эканамічнай, палітычнай і культурнай галінах. Калі, аднак, Францыя, Англія і ПАЗШ імкнуцца ўцягнуць Нямеччыну ў антыбальшавіцкі адзіны фронт, дык ім трэба адказаць: **«Да таго часу, пакуль Францыя не адмовіцца ад сваіх імкненьняў і гегемоніі за кошт Нямеччыны, да таго часу Нямеччына ня можа выпусьціць з рук расійскі козыр».** (Бурныя выкрыкі на лавах камуністаў: **«Слухайце! Слухайце!»**).

Гэтая цікавая ілюстрацыя замежнай палітыкі нямецкага ўраду. Тут выяўляецца ігра з **краплеными картамі** ў адносінах да працоўнага насельніцтва. (На лавах камуністаў выкрыкі: **«Правільна!»**).

Як толькі Антанта выкажа згоду пайсьці на ўступкі, буйны капітал гатоў адмовіцца ад расійскага козыра. Тут яўна выкрываецца **падаплёка будучай вайны.** (На лавах камуністаў: **«Правільна!»**).

Яшчэ больш у яснай форме прарабілі гэта паны з партыі цэнтру, калі яны ў апошнія тыдні **дзюжынамі езьдзілі ў Парыж,** каб прапанаваць паслугі Нямеччыны ў якасьці найміта для ажыцьцяўленьня анты-бальшавіцкіх плянаў французкага імпэрыялізму. Паны **Браўно і Іос,** пані **Вэбер** і іншыя палітычныя дзеячы з партыі цэнтру вялі ў Парыжы **перагаворы з ваеннымі экспэртамі.**

Слухайце, што мае паведаміць аб парыскіх перагаворах **«Кельнішэ Цэйтунг»:** «Пан Іос і фрэйлен Вэбер з асаблівай падкрэсьленасьцю казалі аб разбуральных сілах, пагражаючых Усходу. Расійскі прызрак пагражае разбурыць старую культуру». (На лавах камуністычных лавах выкрыкі: **«Слухайце, слухайце!»**).

Якімі сродкамі дзейнічае партыя цэнтру ў кампаніі супроць Савецкага Саюзу, паказвае таксама ілюстрацыя. Ня мова ізуіцкага пацера (сьвяшчэньніка) **Мукермана,** выступаўшага

ДЗЕСЯТКІ МІЛЬЁНАЎ РУБЛЕЎ ДАЕ У ПЯЦІГОДКУ

вынаходніцтва тав. Шацкага ў галіне сухой перагонкі дрэва і торфу

Расчысьціць шлях да хутчэйшага прасоўваньня гэтага вынаходніцтва па ўсім СССР

Праз бар'еры шкодніцтва...

У сьнежні мінулага году была выкута «цэгла з коміну»[1]) новага маляр-нага заводу, пабудаванага паводле канструкцыі маладога вынаходцы Шацкага. Завод быў пушчан. Сярава аб вынаходніцтве тав. Шацкага, пры дапамозе РСІ была зрушана з мёртвага пункту.

У той час наша газэта пісала:

— Вынаходніцтва т. Шацкага дае эканоміі 22 млн. руб.!

— Вынаходніцтва тав. Шацкага робіць рэвалюцыю ў смалярнай прамысловасьці!

Мы тады крыху памыліліся ў арытмэтычных разьлічках. Эканомія большая амаль ў два разы. Ня проста рацыналізацыя ў смалярстве, а перакройка ўсіх планаў пяцігодкі, смалярнай прамысловасьці.

Вось як зараз стаіць пытаньне, вось якое значэньне набывае гэта вынаходніцтва!

Апошняя праверка

Чацьверты раз правяралі вынаходніцтва тав. Шацкага на вопытным заводзе. У чацьвёрты і апошні раз за вопытамі, акрамя спэцыялістаў, сачыла вокае вока РСІ. На пасёлку Ягадка, Смалявіцкага раёну, завод пабудаваны Шацкім, а за некалькі кілёмэтраў ад Ягадкі—другі завод з так званымі «польскімі катламі». Абодвы заводы ад начасова прынялі адну і тую-ж вінасьць асмолу. Добра ўзважваўся кожны корч, аглядалася кожная дэталь, кожны працэс, кожны рух ля катла, запісваўся ў «рабочы журнал». Ля абодвых заводаў выдзелены сталыя дыжурствы членаў камісіі. Пачалася гонка.

Каравцей: Завод канструкцыі Шацкага, у параўнаньні з старым спосабам сухой перагонкі дрэва, пры адной і той-жа затраце сыравіны, дае эканомію на апале і павялічвае прадукцыю шпігінару на 60,6 проц. і смалы на 64,1 проц. ці на 100 клгр. асмолу рэторта Шацкага дае 13,67 клгр. смалы, а ранейшы польскі кацёл дае толькі 8,33 клгр. Шпігінару рэторта Шацкага дае 7,39 клгр., а польскі кацёл 4,6 клгр.

Якасьць на 100 проц. вышэй

А па якасьці?

У РСІ нам паказалі дзьве бутэлькі шпігінару. У адной была нейкая вадкасьць падобная да густой чорнай кавы, а ў другой белая празрыстая. У першай бутэльцы шпігінар ад «польскага катла», а ў другой шпігінар—Шацкага. Па адным толькі выглядзе можна бачыць, што якасьць шпігінару Шацкага бясспрэчна лепшая. Хімічны аналіз паказаў, што шпігінар Шацкага, экспартны тавар будзе ацэньвацца на 100 проц. даражэй за шпігінар ад існуючых катлоў.

У чым сутнасьць вынаходніцтва т. Шацкага? Адкуль крыніцы такой вялікай эканоміі?

Справа ў тым, што апроч павялічэньня колькасьці прадукцыі на 60 і 64 проц. у параўнаньні са старымі мэтадамі работы, вялізарная эканомія дасягаецца яшчэ тым, што калі «польскі кацёл» пасьля кожнай выгаўкі павінен дзе дні разгружацца, астываць і зноў награвацца, дык рэторта Шацкага працуе безьспераўпынна. Такім чынам зваротнасьць катла павялічваецца на 100 проц. Толькі гэта перавага ўжо дае эканомію па СССР некалькі дзесятнаў мільёнаў рублёў.

Вялікі ўклад у пяцігодку

Яшчэ. Вынаходніцтва Шацкага дае магчымасьць на тым-жа заводзе каксаваць торф і разьвіваць сыпірта-парашковую вытворчасьць. (Да гэтага часу торф каксаваўся на асобных заводах кастравым спосабам, правільней кажучы торф закопваюць у яму і там яго каксуюць). У адной толькі БССР мае́ць 150 такіх заводаў (гэта апроч праектаваных паводле пяцігодкі). Вынаходніцтва т. Шацкага дае магчымасьць аб'яднаць абодвы віды вытворчасьці са смалярствам. Усё гэта зноў дае надзвычай вялікую эканомію, якая вылічваецца мільёнамі.

Нарэшце, простае павялічэньне прыбытку пры экспарце. Мы ведаем, што прадукцыя смалярных заводаў тарфяны воск, сыпірта-парашок, шпігінар зьяўляецца адным з асноўных відаў экспарту і вельмі важным на сваім значэньні для прамысловасьці СССР.

Такім чынам, мы зараз ня можам дакладна назваць лічбы фактычнай эканоміі, але мы ведаем, што толькі па РСФСР у гэтым годзе праектуецца пабудаваць 800 «польскіх катлоў», і вось калі замяніць гэтыя катлы катламі Шацкага, дык эканомія перавысіць тыя 22 млн., пра якія мы гаварылі раней.

Вынаходзтва тав. Шацкага мае Ўсесаюзнае значэньне. Гэта ясна. Мы можам назваць гэта вынаходзтва ўкладам ў пяцігодку і не памылімся.

Гандляры—шкоднікі

Вынаходзтва т. Шацкага тэнэльна тым, што яно простае. У «польскіх катлох» тэмпэратура пры выгаўцы зьверху і зьнізу розная, таму частка асмолу перагарае, а частка застаецца нескарыстанай. У рэторце-ж Шацкага дасягнута аднолькавая тэмпэратура і кацёл высмоктвае ўсё тое, што дрэва можа даць.

Пасьля доўгіх дакучлівых прыставаньняў Шацкага ў Белдзяржгандлі рашылі даць яму завод у Ягадках. Як зараз высьвятляецца ў Ягадках, у тым месцы, дзе зьбіраліся будаваць вопытны завод, і дзе завод фактычна пабудаваны, няма зусім сыравіны. Такім чынам сама пабудова гэтага заводу ў гэтым месцы вызначае адносіны Белдзяржгандлю да гэтага вынаходзтва.

Замест шасьці тыдняў завод будавалі 6 месяцаў. Пабудовай варочалі былыя гаспадары-смаляры Мэрліс і Мэрлін.

„Бі яго карчом"!

Мы пісалі ўжо аб яўным шкодніцтве гэтых двух гаспадарчыкаў. Апроч простага шкодніцтва «будаўнікі» пераплачвалі «сваім людзям» на пабудове шалёныя сродкі. Зарплата мулярам дасягала 100 р. у дзень. Шацкага ня пушчалі начаваць толькі таму, што Мэрліс настроіў насельніцтва пасёлку супроць «афэрыста». Гэты-ж Мэрліс загадвае Мэрліну, што калі Шацкі запатрабуе цярабоўку карчоў:

— Бі яго карчом!

Мэрліс у той-жа дзень, калі вопыты завод быў гатоў і Шацкі выклікаў з Менску камісію Белдзяржгандлю, на кіроўвае ў Менск тэлеграму такога зьместу:

— Завод абвал. Умацаваньні разбурваюцца. Абвален кавалак катла.

А на справе нічога гэтага ня было. У адным месцы адвалілася тынк, які за паўгадзіны можна направіць. Праваакцыйная тэлеграма затрымала камісію.

Яшчэ 15 кастрычніка быў складзен гістарычны акт, які даводзіў аб дзівосных выніках на вопытным заводзе

Шпунт ківае на Амэрыку

Яўнае шкодніцтва інжынэра Шпунта, яка ставіў палкі ў колы маладому вынаходцы, не атрымала належнага ад пору з боку вялікага раду арганізацый зацікаўленых у вынаходзтве.

Вось што гаворыць Шпунт «у сваё апраўданьне» па гэтай справе:

— Інжынэр Рэцкі гаварыў мне пра нейкага прыкашчыка гр. Шацкага і пра яго вынаходзтва. Я згадзіўся з Гэцкім, што ад гэтага вынаходзтва нельга чакаць ніякіх вынікаў, бо яшчэ ў 1898 г. і 1904 г. я пабудаваў у Багушэвічах Гуменскага павету 10 рэторт. прапрацаваў 8 месяцаў і выкінуў іх.

— Гэта не навіна—далей гаворыць ён—прафэсар Нагін у сваёй кнізе «Сухая перагонка дерева» (стар. 32) паведамляе аб такой сыстэме, але ўсё-ж аддае перавагу «польскім», г. зн. беларускім катлом (стар. 262).

У гэтым месцы на старонках паказаньняў інжынэра Шпунта красуецца надпіс абуранага інспэктара РСІ:

— Калі так, дык Нагін нічога не разумее!

Далей Шпунт у сваіх паказаньнях ківає на Амэрыку:

— У сучасны момант—піша ён—адгонка парам ўтвараецца ў Амэрыцы і вынаходзтва гэта больш рацыянальна

Кожны смаляр ведае, што адгонка пораю робіць у некалькі разоў даражэйшай прадукцыю «польскіх катлоў».

Інжынэр Шпунт сьвядома шкодзіў і тармазіў вынаходзтва тав. Шацкага.

„Энтузіяст"—Рэцкі

А вось другі спэцыяліст інжынэр Рэцкі. Гэты, пасьля ўжо зьяўленьня першага выкрываючага артыкулу ў газэце «Савецкая Беларусь» прыбег у эдакцыю з лістом. У гэтым лісьце Рэцкі клянецца, што «чула прыслухоўваецца да голасу пралетарскай грамадзкасьці», на цэлую сторонну расьвісвае аб тым, што яму «дорага справа будаўніцтва сацыялізму» і пры знае свае памылкі. А разам з тым, праз некалькі тыдняў пасьля гэтага наведаньня, Рэцкі зноў дыэертыруе з камісіі РСІ, якая працавала ў Ягадках.

Гэты-ж Рэцкі падсоўвае Шацкаму ліст, у якім напісана, што ён Рэцкі сімы сумленны чалавек на земнай кулі, і што Шацкі яго назаўсёды цэніць. Шацкі падмахнуў гэты ліст, але пасьля, прачытаўшы яго, змушан быў адмовіцца ад свайго подпісу.

Рэцкі каяўся ў тым, што ён «зяўны энтузіяст будаўніцтва сацыялізму», а па сутнасьці граў з Шпунтам у адну дудачку супроць «нейкага прыкашчыка» Шацкага.

Дарэчы, хто іншы калі ня Шацкі перакантраваў завод этэрных алеў у Барысаве, пабудаваны два гады таму назад інжынэрам Рэцкім. Два гады завод бязьдзейнічаў, на яго былі затрачаны вялізарныя сродкі і толькі Шацкі, і толькі гэты «прыкашчык» які ня мае спэцыяльнай адукацыі, выправіў памылкі інжынэра Рэцкага.

Ці ёсьць дзе разьвярнуцца Шацкаму

Мы ведаем, што сыпірта-парашковая вытворчасьць мае вялізарнае значэньне для нашай прамысловасьці. З устанаўленьнем прамысловых камбінатаў прадпрыемстваў (а гэта магчыма толькі пры сыстэме завода Шацкага) становішча магчымым скарыстаць усе лясныя адыходы і гэтым самым унесьці вялікую лепту ў пяцігадовы плян нашай сацыялістычнай гаспадаркі.

Якое падтрыманьне аказвалі Шацкаму ў бюро вынаходніцтва ВСНГ? Калі Шацкі зьвярнуўся да кансультантаў ВСНГ інжынэра Романа за дапамогай, той рэзонна адказаў:

— У ВСНГ БССР няма рысавальшчыкаў для вашых чарцяжоў.

Такую-ж «дапамогу» аказвалі яму ў ВСНГ Кейлін і Каўфман. Адзін з іх параіў Шацкаму:

— Ведаеце што, малады чалавек, здымеце вашыя чарцяжы на ватманскай паперы і дуйце ў Ленінград. Тут вам наўрад ці будзе дзе разгарнуцца...

Так зьдзекваліся над вынаходцам у ВСНГ.

А камітэт па хімізацыі пры СНК БССР, на чале якога стаіць інжынэр Натансон, вельмі зацікавіўся вывадамі вынаходзтва, з затым да гэтай справы больш не варочаўся і толькі праз два з паловаю месяцы пасьля таго як РСІ прыступіла да расьледаваньня, пачаў ці кавіцца гэтай справай.

[1]) гл. «Савецкая Беларусь» № 299 за 1930 г.

За канкрэтную рэалізацыю

А Інстытут Прамысловасьці БССР? Там Шацкаму дацэнт Цір заявіў:

— Наша справа кантроль за тым, каб вашы даныя аказаліся правільнымі, а рэшта нас не датычыць.

У той час, як першыя акты давалі бліскучыя вынікі, Белсампрамсаюз абмежаваўся тым, што падпісаў акт... на мест таго, каб прасунуць гэта вынаходзтва ў жыцьцё.

Белсампрамсаюз і Лесбел прыцягваліся органамі РСІ да гэтай справы літаральна «за валасы». Зараз, калі вынаходзтва зрабілася зусім бясспрэчным, абедзьве арганізацыі пачалі спрачацца каму належыць гонар кіраўніцтва справаю смалярства, а каб практычна прасунуць гэту справу, аб гэтым абедзьве гэтыя арганізацыі яшчэ не подумалі як следа.

Ні прафэсіянальныя арганізацыі, ні партыйныя арганізацыі гораду да гэтага часу не зацікавіліся гэтай справай, да гэтага часу ніхтым не садзейнічаў арганізацыі гэтага вынаходзтва ў жыцьцё.

Вынаходца тав Шацкі.

Вынаходніцтва тав. Шацкага прасунуць па ўсім СССР

Вынаходзтва тав. Шацкага мае ўсесаюзнае значэньне. Ня гледзячы на тое, што аб ім загаварыў усесаюзны друк (праўда, ня зусім голасна). Усесампрамсаюз, які разьвівае вялізарнейшую работу па смалярстве ў СССР, яшчэ да гэтага часу не зацікавіўся гэтым вынаходзтвам. І ўсё гэта ня гледзячы на неаднаразовыя напамінкі з боку РСІ БССР.

Мы лічым, што малейшае затрыманьне з рэалізацыяй вынаходзтва Шацкага робіць вялізарныя страты дзяржаве. У сувязі з шырокім разьвіцьцём смалярнай справы па Саюзе паўстае задача перагляду ўсёй пяцігадовай праграмы ў гэтай галіне прамысловасьці і ўнясеньня туды істотных карэктыў у сувязі з вынаходзтвам т. Шацкага.

Гэта трэба зрабіць як найхутчэй.

Асноўнымі штуршкамі да хутчэйшага прасоўваньня вынаходзтва ў жыцьцё павінны паслужыць рашэньні бліжэйшага паседжаньня прэзыдыуму РСІ БССР па гэтай справе.

Б. Брадоцкі.

АД РЭДАКЦЫІ.

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» надаючы вялікае палітычнае і эканамічнае значэньне вынаходзтву тав. Шацкага, бярэ на сябе шэфства над гэтым вынаходніцтвам у мэтах хутчэйшага прасоўваньня яго ў жыцьцё і хутчэйшай яго рэалізацыі.

ТРЫВОЖНЫЯ СЫГНАЛЫ

з гомельскіх лесазаводаў—„Калектыўная Праца" і „Сацыялізм"

Адсутнічаньне парткіраўніцтва, праявы правага апартунізму на практыцы, сыстэматычныя прагулы, фабрыка браку, вось рэальныя пагрозы выкананьню прамфінпляну першага кварталу. Нанесьці рашучы ўдар па праявах правага апартунізму. Выканаць прамфінплян!

На лесазаводах „Сацыялізм" і „Калектыўная праца" становішча пагражаючае

Ня выконваецца прамфінплян

Лесазавод «Калектыўная Праца» (Гомель), ня гледзячы на правадзімыя вытворчыя мэнэўры і ўнутрызаводзкі конкурс на лепшую работу зьмены, у асобным квартале выканаў свой прамфінплян на 84 проц., у студзені на 93 проц. Лютаўская праграма выканана на 86 проц. Першая дэкада сакавіка дала яшчэ горшыя вынікі, бо праграма выкананa ўсяго на 83 проц.

Завод «Сацыялізм», на гледзячы на тое, што ў асобным квартале ім вытворчая праграма была выканана на 7 проц., у студзені месяцы сваю вытворчую праграму выканаў на 89 проц., у лютым на 94 проц., а першая дэкада сакавіка дала 95 проц.

Як-жа абстаіць справа на заводзе «Калектыўная Праца» і «Сацыялізм» са зьніжэньнем сабекошту? Тут трэба проста сказаць, што дрэнна. Дзякуючы нераспарадчасьці заводакіраўніцтва з рабсілай і нерацыянальнаму скарыстаньню яе, дзякуючы сыстэматычным спыненьням варштатаў, замест зьніжэньня сабекошту маецца ладышэць не яго на 24 проц. Напрыклад, калі 1 куба-мэтр драўніны павінен каштаваць заводам 5 р. 03 кап., дык ён каштуе 6 р. 24 кап.

Якасьць прадукцыі дасягае 40—50 проц.

На якасьць выпускаемай прадукцыі ніхто не зварочвае ніякай ўвагі. Маецца шмат выпадкаў, калі ад неўважлівых адносін да работы расьпідлоўчыкаў і варштатных, прадукцыя піламатар'ялаў выпускаецца з бракам да 40—50 проц.

Па пытаньні аб якасьці прадукцыі на заводах нічога ня зроблена. Гэткі мэтад работы ў далейшым ня можа быць цярпімы. Трэба зрабіць рэзкі пералом у рабоце па ладышэньні якасьці прадукцыі.

Лесазаводы бязумоўна маюць усе даныя для таго, каб цалкам выканаць праграму, але-ж карэнны пералом у адносінах да работы ня зроблены. Гэткі мэтад работы ў далейшым ня можа быць цярпімы. Трэба зрабіць рэзкі пералом у рабоце па ладышэньні якасьці прадукцыі.

Лесазаводы бязумоўна маюць усе даныя для таго, каб цалкам выканаць праграму, але-ж карэнны пералом у асобным квартале выканаў свой прамфінплян на 84 проц., у студзені на 93 проц. Лютаўская праграма выканана на 86 проц. Першая дэкада сакавіка дала яшчэ горшыя вынікі, бо праграма выкананa ўсяго на 83 проц.

Завод «Сацыялізм», на гледзячы на тое, што ў асобным квартале ім вытворчая праграма была выканана на 7 проц., у студзені месяцы сваю вытворчую праграму выканаў на 89 проц., у лютым на 94 проц., а першая дэкада сакавіка дала 95 проц.

Як-жа абстаіць справа на заводзе «Калектыўная Праца» і «Сацыялізм» са зьніжэньнем сабекошту? Тут трэба проста сказаць, што дрэнна. Дзякуючы нераспарадчасьці заводакіраўніцтва з рабсілай і нерацыянальнаму скарыстаньню яе, дзякуючы сыстэматычным спыненьням варштатаў, замест зьніжэньня сабекошту маецца ладышэць не яго на 24 проц. Напрыклад, калі 1 куба-мэтр драўніны павінен каштаваць заводам 5 р. 03 кап., дык ён каштуе 6 р. 24 кап.

Якасьць прадукцыі дасягае 40—50 проц.

На якасьць выпускаемай прадукцыі ніхто не зварочвае ніякай ўвагі. Маецца шмат выпадкаў, калі ад неўважлівых адносін да работы расьпідлоўчыкаў і варштатных, прадукцыя піламатар'ялаў выпускаецца з бракам да 40—50 проц.

Па пытаньні аб якасьці прадукцыі на заводах нічога ня зроблена

Пытаньні культурнай рэвалюцыі

На бальшавіцкія тэмпы— другі этап культэстафэты

Арганізаваным правядзеньнем усебеларускіх культманэўраў узьнімем на вышэйшую ступень паход працоўных мас за культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце

Узяць тэмп

З 1 красавіка па БССР будзе праводзіцца другі этап культэстафэты. Сёньня мы зьмяшчаем апошнія тры маршруты культэстафэты: за аўладаньне тэхнікай, за ўдарныя тэмпы ў падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў, за масавае разгортваньне дашкольнага выхаваньня.

Працэсы «прампартыі» і так званага «Саюзнага бюро» РСДРП меншавікоў, шкодніцтва ў розных галінах нашага будаўніцтва, выкрытая верным вартаўніком Кастрычніка—АДПУ, усё гэтае з усёй рашучасьцю паставіла пытаньне наконт аўладаньня тэхнікай і ўзмацненьня работы па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў.

— Аўладаць тэхнікай — вось баявы лёзунг, які быў высунуты тав. Сталіным на Ўсесаюзнай нарадзе працаўнікоў прамысловасьці. На практычнае ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу трэба мабілізаваць шырокія рабочыя і калгасныя масы. За час культэстафэты неабходна дабіцца таго, каб па ўсіх прадпрыемствах, саўгасах і калгасах былі арганізаваны школы, гурткі па вывучэньні працэсаў данай вытворчасьці, падвышэньні кваліфікацыі і г. д.

Задачы ўцягненьня жанчын у вытворчасьць, пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны патрабуюць яшчэ больш шырока разгарнуць сетку дашкольных установаў—дзіцячых ясьляў, садоў, ачагоў і летніх пляцовак. З гэтай задачай мы зможам справіцца толькі пры ўмовах максымальнай мабілізацыі шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

У перыяд 1—5 красавіка ў БССР будзе даны старт другому этапу культэстафэты. Партыйныя, камсамольскія, савецкія, прафсаюзныя і іншыя грамадзкія арганізацыі павінны ўзьняць працоўныя масы на выкананьне задач другога этапу культэстафэты, на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі ў галіне культурнай рэвалюцыі з тым, каб да фінішу (1 ліпеня 1931 г.) прысьці з поўнай перамогай на гэтым найдказнейшым вучастку фронту сацыялістычнага будаўніцтва.

Апэрацыйная зводка

АБ СТАНЕ ЎСЕАГУЛЬНАГА АБАВЯЗКОВАГА НАВУЧАНЬНЯ (ПА 38 РАЁНАХ) І ЛІКВІДАЦЫІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ (ПА 36 РАЁНАХ) НА 10 САКАВІКА 1931 Г.

1. Намечана, паводле пляну адкрыць новых школьных камплектаў 527.
2. Фактычна адкрыта 547.
3. Маецца на вучоце дзяцей 8.10 гадовага ўзросту, падлягаючых абавязковаму навучаньню—145.085 чалавек.
4. З іх фактычна ахоплена пачатковай школай—142.058 чал., што складае 97,9 проц. ахопу.
5. Маецца на вучоце падросткаў 11-15 гадовага ўзросту, падлягаючых абавязковаму навучаньню—47.555 чал.
6. З іх фактычна навучаецца ў школах—45.990 чал., што складае 96,7%.
7. Недахват настаўніцтва для 1-га канцэнтру складае 101 асобу.
8. 38.500 вучняў 1-га канцэнтру забясьпечаны гарачым сьнеданьнем.
9. 5.929 вучняў II-га канцэнтру забясьпечаны гарачым сьнеданьнем.
10. 170 вучняў школ для падросткаў забясьпечаны гарачым сьнеданьнем.
11. Маецца на вучоце няпісьменных ва ўзросьце ад 15 да 45 год — 158.933 асобы.
12. З іх фактычна ахоплена навучаньнем—114.014 асоб, што складае 71,7 проц.
13. Намечана паводле пляну мабілізаваць дабраахвотных культармейцаў—2.181 чалавек.
14. Фактычна мабілізавана 3.476 чал.

УСІМ НІЗАВЫМ САЮЗНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ

і ўсім органам нарасьветы і загадчыкам культустаноў

Накіроўваючы пры гэтым палажэньне аб вытворчых нарадах (зацьверджанае прэзыдыумам ЦП Белпрацасьветы і ўзгодненае з мэтадкомам НКА) ЦП саюзу і НКА зварочвае ўвагу саюзных арганізацый і органаў Нарасьветы на наступнае:

1. Маючыяся арганізацыі па мэтадычнай рабоце культустаноў: школьныя рады, пэдагагічныя нарады, групавыя аб'яднаньні (пацыраныя пэдрады), мэтадычныя і цыклявыя камісіі і г. д. у тым выглядзе, у якім яны існуюць да гэтага часу, часта вядуць да падмены мабілізацыі творчай актыўнасьці шырокіх мас асьветнікаў голым адміністраваньнем.

2. Побач з гэтым назіраецца перагрузка культасьветных і навучальных устаноў рознымі сходамі і пасяджэньнямі, якія часта займаюцца аднымі і тымі-ж пытаньнямі, адрозьніваюцца дубляваньнем, паралелізмам як па зьмесьце сваёй работы, так і ў арганізацыйнай іх пабудове.

3. Выходзячы з інтарэсаў працяналізацыі працы культасьветных устаноў, разгорнутай барацьбы за якасьць гэтай працы і забесьпячэньня поўнай магчымасьці разьвіцьця ініцыятывы шырокіх мас асьветнікаў пад кіраўніцтвам прафарганізацый, прапануем зараз-жа разгарнуць работу вытворчых нарад згодна з далучаным да гэтага палажэньнем.

4. Побач з вытворчымі нарадамі пакуль застаюцца: 1) раймэтадбюро, якое ажыцьцяўляе пад кіраўніцтвам інспэктара нарасьветы агульнае мэтадычнае кіраўніцтва работай школ раёну, 2) школьныя рады з абавязковым разьмежаваньнем іх функцый з функцыямі вытворчых нарад (школьныя рады займаюцца агульнымі пытаньнямі кіраўніцтва работай школы, як напрыклад, шераводы вучняў, кіраўніцтва вучнёўскімі арганізацыямі і г. д.).

Усе астатнія арганізацыі (пэд. рады, мэтад. камісіі, цыклявыя аб'яднаньні і г. д.) ліквідуюцца, бо далейшае існаваньне іх можа пазбавіць вытворчыя нарады іх выхаваўчага значэньня і вытворчага эфэкту і ўносіць толькі блытаніну і непатрэбную перагрузку рознымі пасяджэньнямі.

5. Выходзячы з таго, што вытворчыя нарады ўпяршыню уваходзяць у практыку нашай работы, неабходна з самага пачатку наладзіць вучот, абагуленьне і абмен вопытам, для чаго ўсім прафарганізацыям прапануецца не радзей аднаго разу ў месяц даваць матар'ял вытворчаму сэктару ЦП Белпрацасьветы, характарызуючы работу вытворчых нарад.

Кір. Вытворчага Сэктару Дзятлава.

Старшыня Мэтадкому НКА Ошэраў.

Зацьверджан прэзыдыумам ЦП Белпрацасьветы аб 19-I-31 г., пратакол № 3.

Праект

Агульнага Палажэньня аб вытворчых нарадах у культасьветных установах

Сацыялістычная рэканструкцыя народнай гаспадаркі высунула рад баявых задач перад культурным фронтам, якія ня могуць быць разьвязаны без мабілізацыі ўсяе армеі асьветнікаў для актыўнага і творчага разгортваньня культурнага будаўніцтва.

Асноўнай формай работы прафсаюзу па ўцягненьні шырокіх мас асьветнікаў у сацыялістычнае і культурнае будаўніцтва зьяўляецца вытворчая нарада.

Вытворчая нарада зьяўляецца адной з асноўных форм арганізацыі творчай ініцыятывы мас, уцягненьня яе ў сацыялістычнае будаўніцтва, выхаваньне новых кадраў арганізатараў сацыялістычнага будаўніцтва і разам з тым зьяўляюцца арганізуючымі цэнтрамі кіраўніцтва саюзу і яго паваротам «тварам да вытворчасьці».

У сваёй рабоце, вытворчыя нарады павінны абапірацца на ўдарныя брыгады, як перадавыя авангардныя групы і імкнуцца ўцягнуць усю масу асьветнікаў у сацспаборніцтва, на барацьбу за якасьць работы, разгортваючы новыя вышэйшыя формы ўдарніцкага руху (грамадзкі буксір, скразныя ўдарныя брыгады, апэрацыйна-плянавыя групы, рацыяналізатарскі рахунак, вытворчыя манэўры і г. д.). Накіроўваюць работу ўдарных брыгад і спаборнічаючых на палепшаньне якасьці вытворчай працы, на рацыяналізацыю вытворчых працэсаў і выкананьне вытворчага пляну;

б) Удзельнічаюць пры плянавыя групы ў складаньні вытворчага пляну культустановы, даводзяць яго да вытворчага вучастку, да кожнага працаўніка, арганізуюць зборы прапаноў асьветнікаў і сустрэчныя культпляны, дапамагаюць ускорваць унутраныя рэсурсы для выкананьня і перавыкананьня намечанага пляну;

в) Ажыцьцяўляюць кантроль за ходам выкананьня вытворчага пляну па ўстанове цалкам і асобных яго вучастках, абмяркоўваюць вынікі выкананьня вытворчага пляну (памесячна, паквартальна, па сэмэстрах), садзейнічаюць арганізацыі сыстэматычнага вучоту вынікаў выкананьня вытворчага пляну, сац. умовы, абавязкаў ударніка і ўдарных брыгад, і, на падставе канкрэтных мерапрыемстваў, арганізуюць асьветнікаў на ліквідацыю прарываў на вытворчасьці і выкананьня пляну;

г) Распрацоўваюць мерапрыемствы па рацыяналізацыі вытворчасьці (групы рацыяналізатараў), прадстаўляюць адміністрацыі прапановы членаў саюзу па палепшаньні вытворчасьці, па меры патрэбы арганізуюць кантрольныя брыгады на поўны тэрмін для садзейнічаньня своечасоваму ажыцьцяўленьню гэтых прапаноў;

д) Абмяркоўваюць і вылучаюць кандыдатуры асьветнікаў—ударнікаў на кіруючую работу, а таксама высоўваюць кандыдатуры на вучобу. Аказваюць працоўнае садзейнічаньне ў правядзеньні і ўзмацненьні адзінаначальня ў культустановах.

4. У межах раёну альбо гораду, кіруючыя саюзныя арганізацыі арганізуюць 1-2 разы ў навучальны год вытворчыя канфэрэнцыі па тыпах культасьветустаноў (сацвых, палітасьветнікі, прафасьветныя працаўнікі і г. д.) для абмеркаваньня агульных вытворчых пытаньняў, якія стаяць перад гэтымі тыпамі ўстаноў: кантрольныя лічбы, вытворчыя планы, навучальныя планы і праграмы, якасныя заданьні і г. д.

5. У вытворчыя нарады ўключаюцца, на падставе дабраахвотнасьці, усе працаўнікі данага саюзнага аб'яднаньня, у тым ліку тэхнічныя працаўнікі, адміністрацыйны і гаспадарчы кіруючы склад.

Увага 1. Да работы вытворчых нарад працягваюцца прадстаўнікі камсамольскіх, піянэрскіх, вучнёўскіх арганізацый, прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, МТС, з якімі зьвязана культустанова, культармейцы, прадстаўнікі сэкцыі саветаў, камсод і г. д.

Увага 2. Загадчыкі культустаноў зьяўляюцца абавязковымі ўдзельнікамі вытворчых нарад, прымаючы актыўны ўдзел як у рабоце самой вытворчай нарады, так і ў папярэдняй падрыхтоўцы пытаньняў да нарад.

II. ЗЬМЕСТ РАБОТЫ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД.

Вытворчыя нарады:

а) арганізуюць практычныя мерапрыемствы па разьвіцьці і ўзмацненьні сацспаборніцтва і ўдарнага руху, арганізуюць новыя ўдарныя брыгады і ўцягваюць у іх асьветнікаў, арганізоўваюць праверку і абмяркоўваюць вынікі сацспаборніцтва, разгортваюць вышэйшыя формы ўдарніцкага руху (грамадзкі буксір, скразныя ўдарныя брыгады, апэрацыйна-плянавыя групы, рацыяналізатарскі рахунак, вытворчыя манэўры і г. д.). Накіроўваюць работу ўдарных брыгад і спаборнічаючых на палепшаньне якасьці вытворчай працы, на рацыяналізацыю вытворчых працэсаў і выкананьне вытворчага пляну;

б) Удзельнічаюць пры плянавыя групы ў складаньні вытворчага пляну культустановы, даводзяць яго да вытворчага вучастку, да кожнага працаўніка, арганізуюць зборы прапаноў асьветнікаў і сустрэчныя культпляны, дапамагаюць ускорваць унутраныя рэсурсы для выкананьня і перавыкананьня намечанага пляну;

в) Ажыцьцяўляюць кантроль за ходам выкананьня вытворчага пляну па ўстанове цалкам і асобных яго вучастках, абмяркоўваюць вынікі выкананьня вытворчага пляну (памесячна, паквартальна, па сэмэстрах), садзейнічаюць арганізацыі сыстэматычнага вучоту вынікаў выкананьня вытворчага пляну, сац. умовы, абавязкаў ударніка і ўдарных брыгад, і, на падставе канкрэтных мерапрыемстваў, арганізуюць асьветнікаў на ліквідацыю прарываў на вытворчасьці і выкананьня пляну;

г) Распрацоўваюць мерапрыемствы па рацыяналізацыі вытворчасьці (групы рацыяналізатараў), прадстаўляюць адміністрацыі прапановы членаў саюзу па палепшаньні вытворчасьці, па меры патрэбы арганізуюць кантрольныя брыгады на поўны тэрмін для садзейнічаньня своечасоваму ажыцьцяўленьню гэтых прапаноў;

д) Абмяркоўваюць і вылучаюць кандыдатуры асьветнікаў—ударнікаў на кіруючую работу, а таксама высоўваюць кандыдатуры на вучобу. Аказваюць працоўнае садзейнічаньне ў правядзеньні і ўзмацненьні адзінаначальня ў культустановах.

III. ПАРАДАК І МЭТАДЫ РАБОТЫ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД.

1. Вытворчыя нарады павінны працаваць рэгулярна, сьбіраюцца ў цьвёрда вызначаныя для гэтага календарныя дні, узгодненыя ў адзіным пляне работы ўстановы.

Зьменныя і агульныя (франтальныя) вытворчыя нарады сьбіраюцца па меры патрэбы, але не радзей аднаго разу ў паўтара—два месяцы.

2. Для падрыхтоўкі пытаньняў да вытворчай нарады, арганізуюцца групы з ударнікаў і актывістаў па вывучэньні асобных пытаньняў.

Пры пастаноўцы найбольш складаных пытаньняў арганізуюцца часовыя кантрольныя камісіі—«Ч. К. К.» (на падставе агульнага дэкрэту СНК СССР аб ЧКК ад 31-VIII-1930 г.).

Увага: У надзвычайных выпадках вытворчыя нарады (групавыя, зьменныя, агульныя) могуць быць скліканы ў любы час, ня гледзячы на ўстаноўленыя календарныя тэрміны.

3. Пастановы вытворчых нарад, якія не патрабуюць асобных распараджэньняў адміністрацыі, праводзяцца ў жыцьцё сіламі самых асьветнікаў адразу пасьля вынясэньня гэтых пастаноў (падняцьце працоўнай дысцыпліны, палепшаньне якасьці работы, падняцьце прадукцыйнасьці працы і г. д.).

4. У выпадку калі адміністрацыя не згаджаецца з пастановамі вытворчых нарад па тым ці іншым пытаньні апошняе пераносіцца на разгляд вышэйстаячых саюзных і адміністрацыйных арганізацый, ня прыпыняючы да канчатковага вырашэньня пытаньня, загадаў адміністрацыі.

IV. АРГАНІЗАЦЫЯ КІРАЎНІЦТВА ВЫТВОРЧЫМІ НАРАДАМІ.

1. Агульнае кіраўніцтва работай вытворчых нарад у культустановах ажыцьцяўляецца мясцкомам, селькомам, групкомам.

2. Для практычнага кіраўніцтва работай вытворчых нарад (групавога, зьменнага, агульнага, франтальнага) вылучаюцца сталыя арганізатары з ліку лепшых ударнікаў, на якіх ускладаецца кіраўніцтва работай вытворчага вучастку (групавога, зьменнага, агульнага).

3. Арганізатары групавых і зьменных вытворчых нарад працуюць пад агульным кіраўніцтвам арганізатараў агульнай (франтальнай) вытворчай нарады, які каардынуе работу ўсіх вытворчых нарад і мае плян працы вытворчых нарад усяго калектыву.

4. Арганізатары групавых, зьменных і агульных вытворчых нарад працуюць пад непасрэдным кіраўніцтвам кіраўніка вытворчай групы (сэктару) МК, ГК, СК.

V. АБАВЯЗКІ АРГАНІЗАТАРАЎ.

1. У абавязкі арганізатара вытворчых нарад (кожнага вытворчага вучастку), апрача падрыхтоўкі да вытворчай нарады, уваходзіць падагуленьне і фіксацыя ўсіх прапаноў асьветнікаў, якія прыняты на вытворчых нарадах, збор бягучых прапаноў, своечасовая перадача адміністрацыі ўсіх прапаноў як апрабаваных на вытворчых нарадах, так і тых, якія ўступілі ў бягучым нарадзе, якія паводле сваёго зьместу не патрабуюць абмеркаваньня на вытворчых нарадах.

2. Ён арганізуе праверку выкананьня прапаноў вытворчых нарад і асобных асьветнікаў і мае права стаўць пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці асоб, якія вінаваты ў невыкананьні прапаноў, на падставе дэкрэту СНК СССР ад 31-VIII 1930 г.

Маршрут № 4

За аўладаньне тэхнікай

«Кажуць, што цяжка аўладаць тэхнікай,—ня праўда, няма такіх крэпасьцяй, якіх бы бальшавікі не маглі ўзяць». (Сталін).

1. Шырака папулярызаваць прамову таварыша Сталіна на Ўсесаюзнай нарадзе прамысловых працаўнікоў аб аўладаньні тэхнікай, мабілізуючы рабочых і саўгасных масы на практычнае яе выкананьне.

2. Правесьці работу на ўсіх прадпрыемствах, саўгасах і калгасах за ўвядзеньне мінімуму тэхнічных ведаў.

3. Арганізаваць пры ўсіх прадпрыемствах, саўгасах і калгасах тэхнічныя школы, выходзячы з задач аўладаньня працэсамі дадзенай вытворчасьці. Школы арганізаваць—першапачатковай кваліфікацыі, павышэньня кваліфікацыі і падрыхтоўкі майстраў і брыгадзіраў.

4. Правесьці ўцягненьне культасьветных сіл гораду і вёскі ў якасьці кіраўнікоў школ па ўладаньню тэхнікай.

5. У рабоце ўсіх культасьветных устаноў адвесьці належнае месца прапагандзе за аўладаньне тэхнікай.

6. Неабходныя сродкі на арганізацыю работы па аўладаньню тэхнікай (літаратура і інш.) вышукаць на аснове грамадзкасьці.

7. Увесьці на ўсіх фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах спэцыяльны дзень «дзень за аўладаньне тэхнікай», у гэты дзень павінны працаваць школы і гурткі па тэхніцы.

Маршрут № 5

За ўдарныя тэмпы ў падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў

«Толькі пры далейшай мабілізацыі сіл ўсяе партыі і рабочае клясы навакол задач падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочае клясы, толькі пры рашучым ўдуруху ў гэтай галіне,—магчыма забясьпечыць далейшае правядзеньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны» (з рэзал. 16 зьезду УсеКП(б)).

1. Правесьці кампанію вясеньняга набору ў ФЗВ і на каротка-тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы адпаведных кадраў.

2. Забясьпечыць камплектаваньне пралетарскім кантынгентам ВНУ і тэхнікумаў пры вясеньнім наборы.

3. Шырока разгарнуць работу па сацспаборніцтву і ўдарніцтву ў навучальных установах, накіраваўшы гэту работу на павышэньне якасьці вучобы.

4. Разгарнуць работу па палепшаньні матар'яльнага забясьпячэньня студэнцтва, асабліва па палепшаньні якасьці харчаваньня.

5. Дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх прыкладаў у рабоце студэнцкіх арганізацый па правядзеньні другой бальшавіцкай сяўбы. Арганізаваць масавыя выезды студэнтаў на вёску для актыўнага ўдзелу ў правядзеньні пасеўкампаніі і калектывізацыі, а таксама ў разгортваньні калгаснага руху.

Маршрут № 6

За масавае разгортваньне дашкольнага выхаваньня

1. Распрацаваць плян арганізацыі дашкольных летніх устаноў у кожным горадзе і раёне.

2. Правесьці мабілізацыю на аснове грамадзкасьці, неабходных сродкаў для гэтай мэты.

3. Выявіць і ўзяць на вучот памешканьні, у якіх будзе арганізавана работа летніх дашкольных устаноў, правёўшы належнае іх абсьледваньне праз арганізацыю суботніка.

4. Правесьці вылучэньне кіраўнікоў дзіцячых устаноў з работніц і калгасьніц, прапусьціўшы іх праз каротка-тэрміновыя курсы, якія арганізаваць на грамадзкія сродкі ў кожным горадзе і раёне.

5. Правесьці вучот дзяцей рабочых, калгасьнікаў і беднаты, якіх неабходна будзе прыняць у дашкольныя ўстановы і падрыхтоўцы да своечасовага адчыненьня іх.

6. Палепшыць работу існуючых дашкольных устаноў, шляхам умацаваньня матар'яльнай базы, забясьпячэньня іх неабходнымі прадуктамі, а таксама пастаноўкай на належную вышыню выхаваўчай работы, правёўшы элемэнты палітэхнізацыі. Работу дашкольных устаноў прыстасаваць да умоў работы прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў.

Усебеларускі штаб культэстафэты.

З 1 чэрвеня г. г. пры ўсебеларускім палітыка-асьветным тэхнікуме

(Магілеў, Камсамольская, 28)

адкрываюцца **4-хмесячныя падрыхтоўчыя курсы** ў гэты тэхнікум

Albor на курсы на мясцох праводзяць райкомы і гаркомы партыі ня менш двух чалавек з кожнага раёну і 5 чал. з гарсавету. Для паступленьня на курсы патрэбны веды за 4-5 груп сямігодкі, у іншым кіравацца правіламі прыёму ў тэхнікумы на 1931-32 нав. год.

Дырэктар тэхнікуму КАПАЕВІЧ.

З лістоў рабселькораў

Настаўнікі Забалоцкай школы (Расонскі раён) т.т. Астраўцоў і Вусаў стаяць у баку ад грамадзкай работы. Пікпункту пры школе няма, настаўнік кажуць, што гэта ня іх справа. Не прымаюць гэтыя настаўнікі ўдзелу і падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

Трэба спадзявацца, што райпраўленьне саюзу асьветнікаў падцягне гэтых настаўнікаў.

Калпак.

З 1924 году будуецца школа ў м. Бардзілаўка (Сьмілавіцкі р-н). Райвыканком, відаць, чакае пакуль лесаматар'ялы зусім загніюць.

Брыгадзір.

86 настаўнікаў Лоеўскага раёну на апошняй канфэрэнцыі замацавалі сябе на рабоце ў раёне да канца пяцігодкі і абавязцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

П. Клімава.

У в. Карунах (Дубровенскі раён) пачынна будавацца плянавая школа. Лесматар'ял быў насельніцтвам ў грамадзкім парадку вывезен яшчэ год таму назад. Будаўніцтва школы з месца не рушыцца. Больш таго, значная частка бярвеньня дагэтуль яшчэ не акорана.

Райвыканком, зьвярні ўвагу на бясстрытульную школу.

Ш—ка.

Асьветнікі м. Талочына засталіся бяз чырвонага кутка. Няма дзе настаўнікам сабрацца для сваёй мэтадычнай работы, няма дзе разгаварыць і культработу. Райвыканком абяцаў даць памяшканьне для чырвонага кутка, але далей абяцанак справа ня ідзе.

Любчанскі.

Слуцкаму раёну ня толькі лес не адпушчан для новага школьнага будаўніцтва, але нават не атрыманы яшчэ і нарады на высечку лесу. Калі такімі тэмпамі справа пойдзе і дзлей, дык школьнае будаўніцтва ў раёне будзе сарвана.

У гэту справу павінна ўмяшацца РСІ.

Івакіцкі.

Польская школа калгаснай моладзі ў м. Талочын засталася без настаўніка грамадазнаўцы, бо яго Райвыканком прызначыў на другую работу. Між тым, ёсьць пастанова ўраду, каб настаўнікі, якія працуюць не па спэцыяльнасьці, былі зняты і накіраваны ў школы. Талачынскі РВК, відаць, запамятаў пра дырэктывы ўраду.

Любчанскі.

У Астрашыцкім сельсавеце Азаравіцкага раёну прыказчык Пунтус пакідае ў краме прыказчыцу, а сам на доўгі час зьнікае. Прыказчыца займецца размовамі з хлапцамі, а тым часам краму абкрадаюць. Прымеце захады!

Бачыўны.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Мен. Гар. КК КП(б)Б і ЦСПСБ паведамляе, што 26-III 1931 г. у 6 гадзін увечары ў клюбе саўгандлеслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай) склікаецца гарадзкі зьлёт заводаў—шэфаў над дзяржапаратам і падшэфных установаў на пытаньні аб задачах рабочага шэфства і месячніка па шэфству.

На зьлёт павінны абавязкова зьявіцца сакратары парткалектываў, янгелы, старшыні ФЗМК, шэфствуючыя брыгады, трыкутнікі падшэфных устаноў, рабселькоры, «Лёгкія Казелерыстыя», представаўнікі шматтыражак і насьценгазэт.

Таксама на зьлёт запрашаюцца сакратаўнікі ЦКК—НК РСІ, Гаркому КП(б) Беларусі, Гаркому ЛКСМБ, ЦП Саюзаў і ўсіх рэдакцый газэт «Зьвязда», «Рабочий», «Чырвоная Зьмена», Савецкая Беларусь» і «Акцябр».

Адказнасьць за своечасовую яўку на зьлёт ускладаецца на сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б.

Старшыня Мен. Гар. КК КП(б)Б КЕНІГ.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ

Сход парткалектыву адбудзецца 21-га сакавіка, а 7 гадз. увеч. На парадку дню:

Справаздача камсамольскага калектыву.

Адказны рэдактар П. ШАСТАНОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 16-га САКАВІКА

„Чырвоная Зорка“	У СУМЁТАХ. Звыш праграмы гукавы КІНО-КАНЦЭРТ Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв.
Кіно-тэатр „Культура“	Новы савецкі фільм ЁСЬЦЬ КАПІТАН. Звыш праграмы: УСЕНАВУЧ. Пач. а 7, 8,45 і 10,30 г. Каса адч. ад 5 г.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	Кіно фільм Саюзкіно Б�ЛАКІТНЫ ПЯСЕЦ. Звыш праграмы палітасьветны фільм ЗМОВА ІНТЭРВЭНТАЎ. Пач. а 6 гадз. Каса адч. з 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	У горад уваходзіць нельга. Пач. а 6 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	Зьве фільмы ў адзін сэанс 1. МІТРОШКА САЛДАТ—у 6 частках. 2. ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ—у 3 ч. Пач. а 1 гадз. Каса адч. з 12 г. дню.

Паведамляецца для ведама грамадзян гор. Менску,

што ў мэтах упарадкаваньня вулічнага руху астаноўкі вагонаў трамваю на рагу Ленінскай і Савецкай з 20 сакавіка гэтага году пераносяцца: пры сьледваньні вагонаў трамвайнай лініі №№ 1, 2 і 3 у бок таварнай і пасажырскай станцый з рагу Ленінскай і Савецкай на рог Савецкай і Камсамольскай, пры сьледваньні-ж вагонаў у бок Камароўкі і Пярэспы—на рог Савецкай і Энгельса вуліц.

Пасадкі і высадкі з вагонаў трамваю на рагу Ленінскай і Савецкай забараняюцца, нават у выпадках астановак вагонаў па тэхнічных прычынах.

Вінаватыя ў парушэньні будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасьці.

Трамвайнае кіраўніцтва.

Беларускае Курортнае Бюро

абвяшчае, што ў зьвязку з скарачэньнем броні **НА КУРОРТЫ** прыём заяў аб прадстаўленьні курортных МЕСЦ — **СПЫНЕН.**

Раней паданыя заявы будуць разглядацца пасьля **1-га КРАСАВІКА.**

Белкурбюро.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗААТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ АБВЯШЧАЕ КОНКУРС

на замяшчэньне наступных пасад:

Фізыка —	— дацэнт, асыстэнт
Хімія неарганічная —	— асыстэнт
„ арганічная —	— дацэнт
Біяхімія і з аналіз —	— прафэсар, дацэнт, асыстэнт
Фізыялёгія с г. жывёлы —	— дацэнт
Сьвінагадоўля —	— прафэсар, дацэнт
Выраб бэкону і мяса, халадзільная справа —	— дацэнт
Заг'гіена і вэтэрынарыя —	— прафэсар або дацэнт
Арганізацыя жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў —	— прафэсар або дацэнт
Нямецкая мова —	— настаўнік (з аплатай асыст. стаўкі)
Ангельская мова —	— настаўнік (з аплатай асыст. стаўкі)

Тэрмін конкурсу—1 мая 1931 г.

Заявы падаваць з далучэньнем кароткага жыцьцяпісу, дакумантаў, спраўкі аб ранейшай службе, сьпісу навуковых прац і водгукаў іх (калі гэткія маюцца), а таксама водзываў грамадзкіх арганізацый, на адрас: Горкі, Заазінстытут на імя дыр-тара.

Аплата згодна палажэньня СНК СССР ад 22-VIII-30 г. і рэгулямэньне НКТ і НКФ СССР ад 12-X-30 г., за № 218. Кватэра прадстаўляецца па камунальных стаўках.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Магілеўская школа ФЗВ (Камбінат) скураной прамысловасьці з 2 аддзяленьнямі

РЫМАРНА-СЯДЗЕЛЬНЫМ І СКУРАНЫМ

абвяшчае прыём заяў на 1 курс па абодвых аддзял. з 13-III па 1-IV—31 г.

Прымаюцца асобы ад 14—18 год. Асобы, якія скончылі курс 5-ці груп сямігодкі і больш—прымаюцца бяз іспытаў, скончыўшыя 4 групы—праходзяць іспыты.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакумэнты:

1. Анкета па форме, якая ўстаноўлена для ФЗВ, завераная прафэсыянальным або савецкім органам;
2. Дакумант аб узросьце (мэтрыка);
3. Дакумант аб асьвеце;
4. Даведка аб стане здароўя;
5. Даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы: для сялян — даведка аб уплаце с-г падатку; для калгасьнікаў — даведка аб уступленьні ў калгас;
6. Даведка аб праве выбарчага голасу;
7. 2 фатаграфічных карткі.

У гэты набор будзе прынята 175 чалавек.

Усе прынятыя забясьпечваюцца зарплатай 20—30 руб. у месяц.

Інагароднім будзе прадастаўлены інтэрнат.

Заявы накіроўваюцца *Магілеў, Бел. школа ФЗВ (комбінат) скураной прамысловасьці, Ленінская вул. № 43.*

Да заявы прыкладаюцца пашт. выя маркі на 25 кап. для адказу аб прыёме

Заг. ФЗВ скураной прамысловасьці ПІНСКІ

АБ'ЯВА.

Белаптэкакіраўніцтва прапануе

ўсім прамысловым прадпрыемствам навучальным установам, лекавым установам, навукова-дасьледчым, сельска-гаспадарчым і інш. установам спажываючым РЭАКТЫВЫ І ФАРБЫ У СВАІХ ЛЯБАРАТОРЫЯХ прысылаць свае адрасы не пазьней **1-га красавіка г. г.** для ўзяцьця іх на вучот на прадмет забесьпячэньня, па наступным адрасе: *гор. Менск. Савецкая 71, аддзяленьне № 1 Белаптэкакіраўніцтва.*

Па атрыманьні адраса будуць высланы інструкцыі і матар'ялы для складаньня заявак.

Не прадстаўленьне адраса к паказанаму тэрміну пазбавіць магчымасьці быць уключаным у плян забесьпячэньня рэактывамі і фарбамі.

Белаптэкакіраўніцтва.

БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ

ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЮЦЦА

ТЭХНІК-БУДАЎНІК і ІНЖЫНЭР-БУДАЎНІК

Аклад пэнсіі па згодзе

Дапускаецца сумяшчэньне за асобную плату

ПРАУЛЕНЬНЕ.

Заатэхнічны інстытут у Горках

АБВЯШЧАЕ **ВЕСНАВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ**

на факультэт сьвінагадоўлі і аддзяленьне буйнай рагатай жывёлы

Правілы прыёму тыя, што вызначаны ў 1930-31 навучальным годзе НКА.

Прыём заяў праводзіцца да 1-га красавіка, іспыты—з 1-га па 5-е красавіка.

Заняткі пачнуцца 10-га красавіка.

Заявы падаваць на імя прыймовай камісіі Заатэхнічнага Інстытуту г. Горкі БССР

Заняткі са скончыўшымі рабфакі і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ пачнуцца з 1-га красавіка.

ДЫРЭКЦЫЯ ЗААІНСТЫТУТУ.

ПА СТРАХАВАНЬНІ ЖЫЦЬЦЯ ПЛАЦЯЖЫ з 1 красавіка 1931 г. ПРЫМАЮЦЦА ВЫКЛЮЧНА АШЧАДКАСАМІ,

да якіх перайшлі ўсе функцыі па страхаваньні, плацяжы можна перавяраць у аддзяленьнях ашчадкасы, Кіраўніцтва ашчадкасы і дзяржрэзерту БССР.

ЗГУБЛЕНЫ:

Картка на каня, выд. Крупск. РВК на імя Дземенцій Г., квіт. 1451-п.

Камсамольскі білет Сошак М., выд. РК ЛКСМ, квіт. 1451-п.

Вайсковы білет Сошак М., выд. Крупск. РВК, квіт. 1451-п.

Картка на каня, выд. РВК на імя Плеханова С. К., квіт. 1451-п.

Сяброўскі білет Кожанка, выд. профсавет, квіт. 1451-п.

Мэтрычны выпіс Серогін, выд. Скатавіцінскім с-с, пасьведчаньне, выд. Расіновскім с-с, квіт. 1455-п.

Укладная кніжка за № 65 Цыбульскай Н. А., выд. Ледзянскім спажт-вам, квіт. 1455-п.

Атэстат аб скончаньні сямігодкі Ханіна Л., выд. Лёзьнянскай сямігодкай, квіт. 1455-п.

Вучотна-вайсковы білет Пятроўскага К., выд. Лязьнянскім РВК, квіт. 1455-п.

Вучотна-вайсковая кніжка Маскалёва Я. В., выд. Сапротай 64 дыв., квіт. 1455-п.

Вучотна-вайсковая кніжка Шчэрбакова Г. Д., выд. Лёзьнянскім РВК, квіт. 1455-п.

Членскі білет саюзу Рабземлес за № 5184 на імя Алексеева А. А., выд. Вемск. аддз. Рабземлесу, 1920 г., квіт. 1455-п.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.